Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 студзеня 2007 г. пятніца
№ 17 (25882)
Кошт 400 рублёў
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Наша газета ўключана ў «Залаты фонд прэсы» СНД

ВА ЎРАДЗЕ

## Уладзімір СЯМАШКА: «Беларусь праз тры гады будзе актыўна выкарыстоўваць венесуэльскую нафту»

**Аб гэтым заявіў першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка на калегіі Міністэрства прамысловасці.**

«Мы будзем разбаўляць расійскую нафту венесуэльскай», — сказаў ён. Развіваючы эканамічныя адносіны з Венесуэлай, неабходна павялічыць сустрэчныя патокі сваёй прадукцыі на лацінаамерыканскі рынак. Пэўныя крокі ў гэтым напрамку ўжо зрабілі Беларускі металургічны завод, «Гомсельмаш», МАЗ. «Формула нашага выжываннння ў тым, што мы павінны ўмець прадаваць сваю працу. Пакуль мы яшчэ не навучыліся гэта рабіць», — лічыць Уладзімір Сямашка. Беларуская прадукцыя канкурэнтаздольная па цане, сэрвісу і якасці. Але неабходна здолець прапанаваць сваю прадукцыю на рынку па максімальнай цане. Цяпер «мы аддаём сваю працу танна», лічыць Уладзімір Сямашка.

**Лілія КРАПІВІНА, БЕЛТА.**

# Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «БЕЛАРУСЬ НЕ АДМАЎЛЯЕ ЕЎРАПЕЙСКУЮ СІСТЭМУ КАШТОЎНАСЦЯЎ»

**Беларусь знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, і ў нас адзіныя каштоўнасці... Захад упершыню паглядзеў на нас аб'ектыўна ў час апошняга нафтавага крызісу з Расіяй. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю палітолагу Аляксандру Рару для нямецкай «Die Welt».**

Адказваючы на пытанне, ці не зблізіла Беларусь і Захад спрэчка з Расіяй, Аляксандр Лукашэнка заўважыў: «Я не ведаю. Але Захад зразумеў: заўтра Расія можа перакрыць кран і яму».

Расія гуляе сваімі новымі энергетычнымі «мускуламі» і лічыць, што зноў можа заваяваць увесь свет. Расійская эліта стала ганарыстай, аднак гэта зменіцца са спадам цэн на энерганосьбіты, лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы заклікаў «не дэманізаваць» Уладзіміра Пуціна. «Паміж Пуціным і Лукашэнкам няма ніякай асабістай варожасці. Я ведаю Пуціна як ніхто іншы. Ён адкрыты чалавек, і ў яго светлы розум. Калі ён хоча зноў аб'яднаць славянскі свет, павінен рабіць гэта па-іншаму», — лічыць Прэзідэнт Беларусі.

Паводле яго слоў, Барыс Ельцын ведаў, «як схіліць сваіх суседзяў — Украіну і Казахстан — да рэінтэграцыі. Ён ніколі не злоўжываў сваёй уладай, да таго ж энерганосьбіты былі тады вельмі танныя. Ельцын заўсёды гаварыў аб раўнапраўных адносінах, і сёння ён заклікае расійскае кіраўніцтва дзейнічаць больш разумна».

Энергетычны канфлікт з Расіяй паказаў, наколькі Беларусі патрэбны інвестары з Еўропы і ЗША. «Калі б заходнія энергетычныя канцэрны мелі долю ў беларускіх энергатранспартных сістэмах, Расія не была б у адносінах да нас настолькі жорсткай», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Як падкрэсліў Прэзідэнт, беларуская прамысловая прадукцыя яшчэ ў часы Савецкага Саюза была арыентавана на экспарт у заходнім напрамку. «Мы павінны выкарыстоўваць сваё геаграфічнае становішча значна лепш. У хуткім часе будуць распрацаваны канкрэтныя праграмы», — сказаў беларускі лідар.

ЕС і Германія павінны займаць больш самастойную пазіцыю адносна Беларусі. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, крытычная заява па выніках мясцовых выбараў у Беларусі «была загадзя падрыхтавана амерыканцамі, а Еўрасаюз толькі згодна ківаў».

Кіраўнік дзяржавы перакананы, што федэральны канцлер ФРГ Ангела Меркель як старшыня ЕС павінна праяўляць больш інтарэсу да Беларусі. «Мы хочам быць стараннымі вучнямі. Я хачу, каб Беларусь калі-небудзь выглядала так, як Германія або Швецыя. Аднак да гэтага часу Захад нас увесь час адштурхоўваў», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

На рэпліку Аляксандра Рара: «Уладзімір Пуцін сказаў, што Расія субсідзіруе 41 працэнт бюджэту Беларусі», — Аляксандр Лукашэнка адказаў: «У Расіі разыгрываецца камедыя. Пасля таго, як расійская грамадскасць задалася пытаннем, чаму Крэмль задушыў сваіх славянскіх братоў, Пуціну такім чынам давялося апраўдвацца перад уласным насельніцтвам. Расійскае насельніцтва адмоўна адрэагавала на тое, што нам другі раз з 2004 года перакрылі энергетычны кран. Рускіх і беларусаў аб'ядноўвае кроўнае сваяцтва. У нашых народаў моцнае пачуццё салідарнасці, якое жывіцца ўспамінамі аб Айчыннай вайне. Калі Гітлер напаў на СССР, Беларусь страціла трэць свайго насельніцтва».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Мы па-ранейшаму выступаем за Саюзную дзяржаву з Расіяй, дзе абедзве дзяржавы былі б раўнапраўныя». «Аднак я ніколі не згаджуся на паглынанне Расіяй Беларусі. Не для таго я ў свой час быў выбраны першым Прэзідэнтам, каб праз дзесятак гадоў убраць маю краіну з геаграфічнай карты Еўропы», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што перад сваёй паездкай у Венесуэлу ён звяртаўся за незалежнай парадай. «Захад перш-наперш павінен адмовіцца ад сярэдневяковай забароны на ўезд беларускіх палітыкаў у Еўропу. Мы не можам крычаць праз агароджу», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён дадаў, што нядаўна ў Беларусь прыязджаў кіраўнік Савета Еўропы для таго, каб «пазнаёміць» з правамі чалавека. «Якія правы чалавека ён меў на ўвазе? У развіцці такой любімай вамі свабоды сродкаў масавай інфармацыі ў нас, магчыма, яшчэ ёсць недахопы, але ЕС павінен прызнаць, што ў нас людзі могуць адчуваць сябе ў бяспецы. Узровень злачыннасці ў нас — адзін з самых нізкіх у Еўропе, і ў людзей ёсць работа», — заявіў беларускі лідар.

«Еўропа павінна навучыцца лепш разумець нас. Момант для гэтага цяпер спрыяльны», — перакананы кіраўнік беларускай дзяржавы.

Беларусь дапамагае Еўрасаюзу абараняць яго ўсходнія граніцы, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Мы затрымліваем большую частку нелегальных мігрантаў і злачынцаў, якія накіроўваюцца ў ЕС з усходу, і вяртаем іх туды, адкуль яны прыбылі. Мы трацім на гэта значныя фінансавыя сродкі і з'яўляемся для Еўропы своеасаблівым абаронным валам. Сёння нелегалы прабіраюцца на захад праз Прыбалтыку і Украіну. А наша граніца непранікальная. І як ЕС аддзячвае нас? Эканамічнымі санкцыямі і пазбаўленнем Беларусі мытных прэферэнцый», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што страты беларускага боку складаюць $300 млн. «Мы будзем кампенсаваць іх павышэннем транспартных тарыфаў на еўрапейскія транзітныя грузы, што паступаюць у Расію праз нашу тэрыторыю. На гэтых новых пошлінах мы змаглі б зарабіць да мільярда долараў, аднак я не хачу новага канфлікту з ЕС», — падкрэсліў беларускі лідар.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, «украінская канстытуцыйная рэформа адкінула краіну назад у яе развіцці».

Гаворачы пра Беларусь у сувязі з гэтым, Прэзідэнт адзначыў, што пасля распаду СССР наша краіна была парламенцкай рэспублікай. «350 дэпутатаў хацелі кіраваць краінай, але ніхто ні за што не адказваў. Яшчэ ледзь-ледзь, і нашы дэпутаты сталі б такімі ж карумпіраванымі, як сёння ў Расіі і Украіне. Зрэшты, у Беларусі сам парламент вырашыў ператварыць краіну ў прэзідэнцкую рэспубліку. Цяпер становішча ў нас стабільнае», — падкрэсліў беларускі лідар. Сваімі паводзінамі Расія паламала наш Мытны саюз, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы прымем контрмеры і будзем патрабаваць зямельны падатак за транзіт расійскіх энерганосьбітаў па нашай тэрыторыі. У сувязі з гэтым мы паглядзелі, як у прававых адносінах рэгулюецца транзіт энерганосьбітаў у Амерыцы. Мы павінны кампенсаваць рост цэн, які ініцыіруе Расія», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён назваў «поўным глупствам» абвінавачанні Расіі ў тым, што Беларусь купляе расійскую нафту па нізкіх цэнах, перапрацоўвае яе і затым перапрадае па цэнах сусветнага рынку. «Мы купляем расійскую нафту па цэнах сусветнага рынку, мы плацім за тону нават на 40 долараў больш, чым Украіна, — заявіў беларускі лідар. — Мы самі спажываем 8 млн. тон, 20 млн. мы перапрацоўваем на нашых нафтаперагонных заводах і прадаём як змазачныя сродкі і гаручае. Таксама з расійскай нафтай робяць і іншыя вядучыя індустрыяльныя дзяржавы, у прыватнасці Германія».

«Расійскі ўрад збіраўся прадаваць нам газ па цане 200 долараў за тысячу кубаметраў — за тую ж цану, што і Германіі. «Газпрам» ужо ў 2004 годзе ўзняў для нас цану ўдвая. Цяпер, праз два гады, новае падваенне цэн. Якая эканоміка можа вытрымаць такое?.. На нас «Газпрам» проста хацеў зарабіць дадатковыя 2 млрд. долараў. За пастаўкі нафты ў Беларусь Расія раптам запатрабавала выплаты экспартнай пошліны ў памеры 170 долараў за тону, каб атрымаць яшчэ 3 млрд. долараў. Увогуле — 5 млрд. дадатковага прыбытку! Сёння ўвесь бюджэт Беларусі складае 14 млрд. долараў. З боку Расіі гэта быў прымітыўны, але непрадуманы разлік!.. Далей: Расія запатрабавала ад нас на нафту значна больш, чым яна каштуе на сусветным рынку. Рускія ўвялі сваю экспартную пошліну, мы следам узнялі транзітную пошліну... Дзе тыя мільярды долараў, якімі Расія быццам бы субсідзіруе нашу эканоміку? Калі б усё так і было, нашы адносіны з Масквой былі б значна лепшымі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён растлумачыў, што беларускія апазіцыянеры часцей бываюць на Захадзе, чым дома. «Яны атрымліваюць на Захадзе грошы і затым вяртаюцца з дапамогай ад заходніх фондаў. Многія з іх карумпіраваныя. Як беспрацоўны старшыня партыі, які заяўляе аб тым, што яго месячны даход складае 100 долараў, можа пабудаваць уласную вілу? У Германіі да яго даўно б наведалася падатковая паліцыя», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, у час нядаўніх мясцовых выбараў у апазіцыі была магчымасць выступаць па беларускім тэлебачанні. «Але сваімі дрэннымі выступленнямі яны страцілі падтрымку насельніцтва і атрымалі на выбарах 1,5 працэнта галасоў», — адзначыў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка дадаў: «Апазіцыя ў Беларусі зусім не забаронена. Наша інфармацыйная прастора адкрыта. Euronews, RTVi, Radio Liberty, CNN вяшчаюць на нашых частотах на заходнія грошы. Яны і расійскія СМІ прастрэльваюць нашу краіну з захаду на ўсход і з усходу на захад. Наша апазіцыя не вылазіць з гэтых СМІ».

Усе расійскія тэлекампаніі прытрымліваюцца адной, устаноўленай зверху лініі, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, у час канфлікту з Расіяй ён хацеў арганізаваць прэс-канферэнцыю ў Маскве, каб растлумачыць свой пункт гледжання. Крэмль забараніў гэту прэс-канферэнцыю. Тады Аляксандр Лукашэнка зусім адмовіўся ад паездкі.

Аляксандр Лукашэнка не выключае, што Беларусь у будучым можа перайсці на еўра. У гэтым жыцці ўсё магчыма... Мы хацелі б, каб Еўрасаюз адкрыў для нашых тавараў свой унутраны рынак, каб мы маглі там канкурыраваць. Менавіта нямецкія бізнэсмены называюць нашу эканоміку больш стабільнай у параўнанні з многімі іншымі ўсходнееўрапейскімі краінамі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, Расія стала навязваць сваю валюту Беларусі, «калі ў Маскве зразумелі, што Лукашэнка не адмовіцца ад незалежнасці сваёй краіны». «Мы бачым у гэтым каварную задуму адабраць нашу незалежнасць абходным шляхам. Але мы не хочам атрымліваць свае зарплаты з Крамля. Зрэшты, наш беларускі рубель мацнейшы, чым расійскі, наша інфляцыя ўдвая ніжэйшая, чым у Расіі. Ніхто ў Беларусі мяне б не падтрымаў, калі б я цяпер здаў нашу валюту», — перакананы беларускі лідар.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

# ЗДАРОВАЯ ВЫСТАВА

## Ў ЧАКАННІ ЗДАРОВАГА АЖЫЯТАЖУ

**З 31 студзеня па 2 лютага ў Мінску, у выставачным павільёне «БелЭКСПА», адбудзецца III Міжнародная спецыялізаваная выстава «Тыдзень моды на здароўе». Уваход — бясплатны.**

Сёлета экспазіцыя размесціцца на пляцоўцы, плошча якой складае 1400 квадратных метраў. Гэта дазволіла запрасіць да ўдзелу больш як 70 экспанентаў і арганізаваць насычаную шоу-праграму, захапляльныя нумары ў выкананні артыстаў Беларускага дзяржаўнага цырка і цыркавога вучылішча, паказальныя выступленні студэнтаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка. Упершыню па перыметру выставачнай залы размесцяцца спартыўна-гульнявыя пляцоўкі пад баскетбол, валейбол, бадмінтон, гандбол, футбол, міні-футбол, пад рынг — для боксу, дзюдо, таэквандо, пад сілавыя віды спорту — для цяжкай атлетыкі, паўэрліфтынгу, гіравога спорту, а таксама пляцоўкі для гарадошнага спорту, гульні ў шашкі, шахматы, спартыўны брыдж, більярд і настольны тэніс. Ганаровы госць выставы — Беларуская федэрацыя коннага спорту, якая прадставіць шырокую праграму з правядзеннем майстар-класаў па верхавой яздзе.

Паводле слоў першага намесніка міністра інфармацыі Беларусі Ліліі АНАНІЧ, на якасна новы ўзровень выходзіць сёлета «Тыдзень моды на здароўе» — мерапрыемства, якое аб'яднала вакол тэмы «стварэння здароўя» вялікую колькасць зацікаўленых міністэрстваў, ведамстваў, устаноў, прадпрыемстваў. Прэзентацыі, віктарыны, конкурсы і нават продаж тавараў стануць магчымымі дзякуючы ўдзелу палацаў спорту, спартыўна-аздараўленчых комплексаў, дзіцяча-юнацкіх клубаў і школ, фітнэс-цэнтраў, санаторыяў, дамоў і баз адпачынку, спартыўных клубаў і таварыстваў, медыцынскіх і касметалагічных цэнтраў, айчынных і замежных вытворцаў абсталявання, інвентару для спорту і актыўнага адпачынку, вытворцаў і і прадстаўнікоў гандлёвых марак спартыўнага адзення і абутку, фірмаў і гандлёвых прадстаўніцтваў у Беларусі, якія пастаўляюць спартыўна-аздараўленчае абсталяванне вядучых вытворцаў свету, турыстычных клубаў, прадпрыемстваў па вырабу аздараўленчых прадуктаў харчавання.

Наведвальнікаў чакаюць кансультацыі спецыялістаў НДІ пульманалогіі і фтызіятрыі, НДІ траўматалогіі і артапедыі, Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння, Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця», Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія».

Паводле слоў першага намесніка міністра аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Роберта ЧАСНОЙЦЯ, выстава не толькі яшчэ раз нагадае беларусам пра актуальныя праблемы ў галіне здароўя, але і падкажа, як процістаяць артэрыяльнай гіпертэнзіі, эфектыўна «перамагчы» лішнюю вагу, атрымаць карысную параду псіхатэрапеўта, дзе шукаць і знаходзіць эфектыўныя спосабы рэабілітацыі для папярэджання інваліднасці. Дарэчы, у рэспубліцы на базе ўстаноў аховы здароўя працуе звыш 3 тысяч школ здароўя. Функцыянуюць псіхатэрапеўтычныя кабінеты ці аддзяленні, «тэлефоны даверу» для аказання экстраннай псіхалагічнай дапамогі.

Цікава, што ў працэс аздараўлення апошнім часам актыўна ўключаецца ўласна чыноўніцтва. Так, згодна з данымі Міністэрства спорту і турызму, пры міністэрствах і ведамствах краіны створаны 27 спартыўных клубаў, а для іх работнікаў запланавана на гэты год правядзенне 37 спартакіяд.

Міністэрства адукацыі прымеркавала да «Тыдня моды на здароўе» пачатак шырокамаштабнай акцыі «Здаровы я — здаровая краіна!», якая стартуе на стэндзе міністэрства 1 лютага і ахопіць ўсе ўстановы адукацыі, навучэнцаў і студэнтаў, настаўнікаў і выкладчыкаў.

На базе Рэспубліканскага гарналыжнага цэнтра «Сілічы» адбудзецца міжнародны прэс-семінар «Дзяржаўная палітыка аховы здароўя Беларусі, Расіі і Саюзнай дзяржавы», на які запрошаны журналісты Расіі, урадавая дэлегацыя Маскоўскай вобласці. У межах сёлетняй тэмы будуць абмеркаваныя пытанні развіцця спорту высокіх дасягненняў, масавага спорту і фізкультурнага руху, прапаганды здаровага ладу жыцця сіламі сродкаў масавай інфармацыі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# ААТ «Слуцкі цукров617рафінадны камбінат»: ЕЎРАПЕЙСКІЯ ТЭХНАЛОГІІ І ЯКАСЦЬ









Шчыт кіравання цеплаэлектрацэнтралі: аператар Аляксандр МАРОЦКІ і начальнік Васіль ЛАПУЦЬ.

**У шматвяковай гісторыі Слуцка 40-гадовая гісторыя тутэйшага цукровафінаднага камбіната — адрэзак часу не надта вялікі. Але дзякуючы свайму вытворчаму патэнцыялу, запатрабаванасці прадукцыі, якая тут выпрабляецца, прадпрыемства з года ў год хутка развівалася і неўзабаве імкліва вырвалася ў лік вядучых не толькі ў гэтым старажытным горадзе, а і ва ўсёй перапрацоўчай галіне Беларусі. Сёння слуцкіх цукраварaў добра ведаюць і за межамі краіны, у прыватнасці, у Расіі, куды адсюль трымае шлях «салодкае жыццё».**

**У галіновым аб'ёме вытворчасці цукру доля камбіната займае 25 працэнтаў, і гэтая лічба паступова расце. Слуцк — адзіны ў рэспубліцы вытворца рафінаванага цукру-пяску. У суткі тут гатовы адправіць спажыўцам 1,2 тысячы тон прадукцыі.**

**Неўзабаве споўніцца тры гады, як камбінат узначаліў Мікалай Паўлавіч Пруднік — спецыяліст з ліку найбольш вопытных у гэтай справе, які аддаў калектыву без малога трыццаць гадоў. Пачынаў тут аграномам, кіраваў пунктам прыёмкі буракоў, пасля сем гадоў працаваў намеснікам дырэктара па сыравіне. Каму, як не такім прафесіяналам, весці цукраварную справу ў наш час, у XXI стагоддзі. Тым больш, калі з камбінатам звязана ўся працоўная біяграфія, лічы, усё жыццё...**

## ГОД ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

На эканамічнай карце рэспублікі Слуцкі цукровафінадны камбінат з'явіўся ў 1965 годзе. Самім сваім фактам мінулае камбіната заклікае сённяшніх цукравараў да новай плённай стваральнасці, да адказнасці перад пачынальнікамі некалі новай справы, да многага абавязвае. Мінулы год увойдзе ў гісторыю прадпрыемства як год мадэрнізацыі, перабудовы вытворчасці, найбольш важных яе участкаў.

Да гэтага часу, бадай, самай вострай праблемай, «ахілесавай пятой» камбіната, было ўладкаванне гатовай прадукцыі. Інакш кажучы, рытміка вытворчасці не заўсёды супадала з магчымасцямі збыту. Заводскае кіраўніцтва гэтую неадпаведнасць «вылічыла» даўно. І таму ў лютым мінулага года на тэрыторыі з'явілася яшчэ адно прыгожае збудаванне — вежа для бестарнага захоўвання гатовай прадукцыі ёмістасцю 20 тысяч тон. У спалучэнні з такой жа, пабудаванай раней, гэта значна пашырыла магчымасці для манеўра.

Нямала пераўтварэнняў адбылося і на галоўнай вытворчай пляцоўцы. Напрыклад, заменены фільтры ачысткі сіропаў, што станоўча адбілася на якасці прадукцыі. Праведзена частковая замена помпавага парка, што вельмі актуальна для працэсу, пры якім пастаянна перапампоўваецца сотні кубаметраў вадкасці.

Выканана вялікая падрыхтоўчая работа па будаўніцтву жомасушыльнага цэха, у тым ліку заключаны кантракт з нямецкай фірмай «Бютнер» на пастаўку для яго абсталявання коштам адзін мільён 750 тысяч еўра. Да сезона перапрацоўкі буракоў 2007 года цэх павінен быць уведзены ў эксплуатацыю.

Паводле сцвярджэння дырэктара, падаспела нямала спраў і на прыёмных пунктах, якія размеркаваны па сыравіннай зоне. Найперш патрэбна было павысіць магчымасці пераваалкі цукровых буракоў у Клецку. Там забетаніравана пляцоўка памерам 4 тысячы квадратных метраў, што дазволіла павялічыць прыёмку сыравіны да 80 тысяч тон.

Закончыўшы справы на гэтым пункце, цэнтр сваёй увагі кіраўніцтва перамясціла на Цімкавічы і Асіповічы, дзе таксама патрабуецца пашырэнне пляцовак і павышэнне прапускной здольнасці.

З улікам таго, што на прадпрыемстве штогод займаюцца нарошчваннем магутнасцяў па перапрацоўцы буракоў, узнікла праблема павялічыць іх падачу ў вытворчасць. Таму на цэнтральным, прызаводскім буракапункце праведзена замена гідратранспарцёраў з памеру 600 міліметраў на памер у 800 міліметраў, а таксама напорнага трубаправода. Маючы ліцэнзію на вытворчасць будаўніча-мантажных работ, усю гэтую аперацыю ўдалося выканаць уласнымі сіламі, без прыцягнення падрадных арганізацый і ў канчатковым выніку зэканоміць каля 250 мільёнаў рублёў.



Варта толькі прайсці па тэхналагічнай лініі камбіната, каб пераканацца, наколькі гэта складаная і ў той жа час дынамічная, узаемазалежная вытворчасць, якая цяпер істотна абнавілася. Станцыі фільтрацыі, прэсы, цэнтрыфугі — усё вытворчасці вядомых нямецкіх фірмаў «Путч», «БМА». Акрамя таго, што гэтае абсталяванне мае высокія тэхналагічныя характарыстыкі, яно намнога больш эканамічнае, чым тое, якое існавала раней.

— Мы ўкаранілі цеплавыя схемы дацкіх і нямецкіх заводаў, скарацілі спажыванне цеплавой энергіі, — расказвае старшыня назіральнага савета ААТ, спецыяліст па гатовай прадукцыі Восіп Дапіра, які таксама прысвяціў прадпрыемству дзесяткі гадоў. — У выніку расход умоўнага паліва скараціўся ўдвая, як на атрыманні цукру з буракоў, так і на перапрацоўцы сырцу.

Як вядома, вытворчасць цукру — працэс бесперапыннага цыкла, таму прадугледжвае аўтаномнае забеспячэнне і цеплавой, і электрычнай энергіяй. На прадпрыемстве дзейнічае свая ЦЭЦ. Цяпло выкарыстоўваецца на ўнутраныя патрэбы, а таксама на спажыванне ў жылым мікрараёне прамысловай зоны горада. Электраэнергія сілкуе заводскія магутнасці і ў аб'ёме прыкладна 20 працэнтаў выпрацоўкі паступае ў адзіную энергасістэму рэспублікі.

Начальнік ЦЭЦ Васіль Лапуць разлічвае, што праз год на яго ўчастку таксама пройдзе мадэрнізацыя, станцыя набудзе новы сучасны выгляд. І гэта ў магчымасцях камбіната. Бо за апошнія тры гады інвестыцыі ў развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы тут склалі адпаведна 15, 17 і 11 мільярдаў рублёў.

## У ТАНДЭМЕ З СЕЛЬГАСВЫТВОРЦАМІ

У акцыянернага таварыства склаліся трывалыя дзелавыя адносіны з сельскагаспадарчымі арганізацыямі, якія ўваходзяць у яго сыравінную зону, займаюцца вырошчваннем цукровых буракоў. Камбінат увёў у нязменную практыку забеспячэнне іх у поўным аб'ёме насеннем гэтай культуры, сродкамі аховы раслін. Своечасова выдзяляюцца авансы на набыццё гаруча-змазачных матэрыялаў, запасных частак, на забеспячэнне сяўбы і догляду пасеваў. А ў перыяд уборкі ўраджаю камбінат без затрымак разлічваўся за пастаўляемую сыравіну.

Летась, дарэчы, сельгасвытворцы пастараліся як ніколі. Упершыню нарыхтавана звыш 900 тысяч тон буракоў. Рэкордны збор! Ён намнога перавысіў ранейшы лепшы вынік, які зафіксаваны ў 2005 годзе, калі на перапрацоўку паступіла 774 тысячы тон.

Сёння ў гаспадарках укаранёны еўрапейскія тэхналогіі вырошчвання гэтай культуры, якія практычна выключаюць ручную працу. Усе працэсы механізаваны, прычым тэхнікай самых апошніх узораў. Для забеспячэння чысціні пасеваў камбінат набывае неабходныя хімпрэпараты і агрэгаты для іх унясення. Апошнім часам многія гаспадаркі выходзяць на прамыя кантакты з заходнееўрапейскімі фірмамі і самі закупляюць у іх усё неабходнае. У выніку і забяспечваецца нядрэнны збор. Хоць да ўраджаяў у 700—800 цэнтнераў з гектара, як у Францыі ці Германіі, многім нашым вытворцам трэба яшчэ ісці і ісці.

Як лічыць Мікалай Пруднік, у нас яшчэ часта ігнаруюцца такія элементы тэхналогіі, якія напачатку здаюцца малазначнымі, а на самай справе менавіта ў іх крыюцца немалыя рэзервы росту прадукцыйнасці бурачных палеткаў.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*



Працоўная дынастыя КЕРНАЖЫЦКІХ: муж Мікалай Паўлавіч — слесар-рамонтнік, жонка Вера Рыгораўна — апаратчыца варкі утфеля першага прадукту, дачка Ірына — інжынер па якасці працы.

ISSN 1990-763X

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

26 СТУДЗЕНЯ 2007 г. ПЯТНІЦА
№ 4 (15455)

Абітурыент—2007

# ТЭСТЫ ПАВІННЫ АБІТУРЫЕНТАЎ РАНЖЫРАВАЦЬ

## ...а іх спрашчэнне не дазволіць дыферэнцыраваць нават гімназістаў

Заўважана, што чым менш часу застаецца да прыёмнай кампаніі, тым больш гучыць самых розных прапаноў аб дапамозе абітурыентам у падрыхтоўцы да паступлення. Рэпетытарства, нягледзячы ні на што, працягвае «працвітаць». І з гэтым, здаецца, ужо ўсе прымірыліся. Нават **міністр адукацыі Аляксандр РАДЗЬКОЎ** вымушаны быў канстатаваць, што наўрад ці інстытут рэпетытарства моцна пацерпіць ад увядзення поўнай забароны на рэпетытарства, паколькі фізічныя магчымасці вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў не дазваляюць прыняць усіх жадаючых навучацца. Таму нягледзячы ні на што, хоць пад коўдрай, але рэпетытарства будзе існаваць. Калі ёсць попыт, то будзе, адпаведна, і прапанова... Прычым нярэдка на старонках СМІ і ў Інтэрнэце можна сустрэць і даволі сумніўныя прапановы, калі рэпетытары гарантуюць маладым людзям стопрацэнтнае паступленне.

**Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ** вельмі скептычна ставіцца да такіх рэкламных заяў.

— Аналіз вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання за апошнія гады дэманструе ўстойлівую залежнасць асабістых вынікаў удзельнікаў ЦТ ад тыпу навучальнай установы, якую скончыў абітурыент, — тлумачыць ён. — І, як правіла, першыя радкі ў рэйтынгу займаюць выпускнікі гімназій і ліцэяў. А выпускнікі іншых навучальных устаноў ім прайграюць і атрымліваюць больш нізкія вынікі нават пасля інтэнсіўных заняткаў з рэпетытарамі.

Напрыклад, адзін з рэпетытараў абяцае, што на яго занятках, якія доўжацца 1,5 гадзіны, навучэнцы паспяваюць рашыць задач па матэматыцы ў дзесяткі разоў больш, чым на сярэднестатыстычным уроку ў школе. Асабіста я стаўлю такія гучныя заявы пад сумненне: аформіць такую колькасць задач нават з выкарыстаннем камп'ютарнай тэхнікі немагчыма. І з якой, цікава, хуткасцю трэба выконваць вылічальныя аперацыі?

На маю думку, для таго каб стаць студэнтам ВНУ, трэба мэтанакіравана працаваць на працягу ўсіх гадоў навучання ў школе, а за два—тры гады авалодаць усімі нюансамі матэматыкі праблематычна. Дарэчы, у тым выпадку, калі спроба паступлення маладога чалавека аказваецца няўдалай, вельмі зручна абвінаваціць тэсты Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў у празмернай іх складанасці. Мяркую, што асобным рэпетытарам, школьным настаўнікам і нават некаторым бацькам выгадна падтрымліваць гэтыя міфы: рэпетытары і настаўнікі, чыя прафесійная годнасць пацярпела, апраўдваюць такім чынам сябе, а бацькі — нізкую канкурэнтаздольнасць сваіх дзяцей. Пры гэтым застаецца па-за ўвагай той факт, што на кожнае бюджэтнае месца ў ВНУ прэтэндуюць тры абітурыенты, і зразумела, што ўсе яны не могуць быць залічаныя.

На рэспубліканскай нарадзе, дзе абмяркоўваліся стан і перспектывы развіцця агульнай сярэдняй адукацыі, міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў таксама закрануў гэту праблему.

— Я часта сустракаюся з дырэктарамі школ і чую меркаванні, што тэсты — занадта складаныя для выпускнікоў. Прапануюць: а давайце распрацуем тэсты асобна — для матэматыкаў і асобна — для музыкантаў, таму што музыканты не могуць набраць 100 балаў на цэнтралізаваным тэсціраванні. І мне даводзіцца ім тлумачыць, што калі ўсе будуць набіраць 100 балаў, тэст не будзе выконваць сваю галоўную функцыю — ён не пакіне прыёмным камісіям магчымасці для выбару, — падзяліўся з кіраўнікамі абласных і раённых органаў кіравання адукацыяй сваімі думкамі Аляксандр Радзькоў. — Для аднаго дзіцяці тэст, магчыма, і сапраўды складаны, але другі абітурыент з ім цалкам спраўляецца. Галоўнае, што дзякуючы цэнтралізаванаму тэсціраванню мы можам будаваць рэйтынг абітурыентаў. І гэтыя рэчы павінны ўсе ўсведамляць. Дзякуючы тэсціраванню мы пазбавіліся так званага блату пры паступленні і зрабілі прыёмную кампанію празрыстай. Але калі прыёмная кампанія закранае інтарэсы і жыццёвыя перспектывы ўласнага дзіцяці, бацькі, на жаль, разважаюць не заўсёды аб'ектыўна... Правілы прыёму ў ВНУ таксама не могуць усіх задавальняць, паколькі кожны шукае ў іх пункт, які б спрасціў яму задачу з паступленнем, але не заўсёды яго знаходзіць.

У адказ на прапановы па ўніфікацыі па ўсіх дысцыплінах колькасці заданняў у тэсце і часу, які адводзіцца на іх выкананне, Мікалай Фяськоў тлумачыць, што такая практыка прынясе адмоўны вынік. Умоўна кажучы, расставіць кропкі ці націскі ў тэсце па мове прасцей, чым вырашыць задачку па матэматыцы, таму і заданняў у тэстах па дзяржаўнай мове прапануецца 40, а не 25. Між іншым, тэст павінен максімальна поўна ахопліваць змест вучэбнага курса. Тэстолагі звычайна спасылаюцца на крывую Гауса (гэта спецыяльны графік, які адлюстроўвае паспяховасць, якую дэманструюць удзельнікі цэнтралізаванага тэсціравання), і калі такія графікі па розных дысцыплінах супадаюць (а ў нас яны накладаюцца адзін на другі), гэта сведчыць аб тым, што тэсты цалкам спраўляюцца са сваёй задачай, нягледзячы на тое, што колькасць заданняў вар'іруецца па розных прадметах ад 25 да 60. Пераважная большасць абітурыентаў знаходзяцца ў сярэдзіне графіка і, адпаведна, 100-бальнай шкалы. Вынік у 100 тэставых балаў — увогуле вялікая рэдкасць для цэнтралізаванага тэсціравання. Тым не менш амаль заўсёды знаходзяцца абітурыенты, якія дэманструюць такі бліскучы вынік. І гэта з'яўляецца лепшым доказам таго, што з тэстам можна цалкам справіцца. Ёсць меркаванне, што правільны адказ з некалькі прапанаваных можна проста ўгадаць, але, напрыклад, на цэнтралізаваным тэсціраванні па матэматыцы 1700 чалавек «не ўгадалі» ўвогуле ніводнага правільнага рашэння. На тэсціраванні па рускай і беларускай мове таксама знайшліся абітурыенты, якія набралі па аднаму балу.

— Хачу запэўніць, што тэсты абавязкова праходзяць апрабацыю ў ходзе пробнага і рэпетыцыйнага тэсціравання. Час для выканання тэста падбіраецца доследным шляхам, — тлумачыць Мікалай Фяськоў, — з улікам працягласці найбольш прадуктыўнага часу працы. Пры гэтым цалкам тэст павінны выканаць не больш за 5 працэнтаў удзельнікаў тэст-экзамену. Напрыклад, доследным шляхам пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання 2006 года было вызначана, што на ЦТ па матэматыцы для выканання 15 заданняў часткі А добра падрыхтаваным абітурыентам патрабуецца 35—40 хвілін, а вось для часткі В (гэта 10 заданняў) патрабуецца 110—115 хвілін. За гэты прамежак часу каля 5 працэнтаў удзельнікаў паспявалі не толькі рашыць заданні, але і грунтоўна праверыць свае рашэнні. Важна, каб у педагагічных тэстах суадносіны складаных і простых заданняў адпавядалі ўзроўню падрыхтаванасці абітурыентаў. Інакш дыферэнцыруючая здольнасць заданняў тэста будзе блізкая да нуля. Наяўнасць жа найбольш складаных заданняў у тэсце дае магчымасць дыферэнцыраваць абітурыентаў з высокім узроўнем падрыхтоўкі. У нас 40 працэнтаў выпускнікоў сярэдняй школы з'яўляюцца выпускнікамі гімназій, ліцэяў і профільных класаў. І калі мы пойдзем шляхам спрашчэння заданняў, то не зможам дыферэнцыраваць нават гімназістаў.

Ёсць яшчэ адна акалічнасць, якую не трэба скідваць з рахункаў. У немалой ступені няўдачы абітурыентаў на цэнтралізаваным тэсціраванні абумоўлены зусім не прабеламі ў ведах, а недастатковай псіхалагічнай і тэхнічнай падрыхтоўкай. Разгубіліся, не дачыталі заданне да канца, няправільна зразумелі, што ад іх чакаюць складальнікі тэста... Напрыклад, тэмы могуць прапаноўвацца з году ў год адны і тыя ж, а вось фармулёўкі заданняў могуць змяняцца. Дзіўна, але з году ў год абітурыенты дапускаюць у тэстах адны і тыя ж памылкі, у іх «правісаюць» адны і тыя ж тэмы школьнага курса. Напрыклад, на тэсціраванні па рускай мове самымі цяжкімі раздзеламі для абітурыентаў з'яўляюцца «Граматыка», «Пунктуацыя», «Агульныя звесткі аб мове» і «Культура мовы і стылістыка». Для абітурыентаў, якія здаюць на тэсціраванні беларускую мову, самымі складанымі з'яўляюцца тыя заданні, дзе ім трэба вызначыць месца націску ў прапанаваных словах. Праблемы ўзнікаюць таксама з фанетычнымі і арфаэпічнымі асаблівасцямі беларускай мовы, правапісам парадкавых і дробавых лічэбнікаў і г.д. Летась упершыню Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў выдаў зборнікі з аналізам інфармацыі аб выніках тэсціравання за 2005 год. Велізарнейшая праца, якая папярэднічала іх з'яўленню на свет, дазволіла выявіць моцныя і слабыя бакі ў выкладанні вучэбных дысцыплін у школе. У зборніку былі прыведзены найбольш характэрныя памылкі, дапушчаныя ўдзельнікамі цэнтралізаванага тэст-экзамену, давалася поўная характарыстыка кантрольных вымяральных матэрыялаў, структура тэставых заданняў, размеркаванне іх па раздзелах, узроўнях складанасці і відах вучэбнай дзейнасці. Але гэтая інфармацыя аказалася педагогамі незапатрабаваная. Органы кіравання адукацыяй заказвалі па аднаму-два экзэмпляры. Праз некалькі тыдняў павінны паступіць ў гандлёвую сетку зборнікі з аналізам цэнтралізаванага тэсціравання 2006 года, і ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў вельмі спадзяюцца, што, нарэшце, іх праца прынясе плён і будзе карыснай для абітурыентаў 2007 года.

У лютым—красавіку ў краіне павінен прайсці другі раунд рэпетыцыйнага тэсціравання, які таксама лепш не прапускаць. У Рагачоўскім раёне, напрыклад, у мінулым годзе мясцовыя ўлады аплацілі выпускнікам ўсе тры раунды рэпетыцыйнага тэсціравання. А па выніках цэнтралізаванага тэсціравання менавіта рагачоўскія школьнікі атрымалі самы высокі сярэдні бал у Гомельскай вобласці.

— Зразумела, што толькі ўдзел у рэпетыцыйным тэсціраванні не дазваляе спадзявацца на стопрацэнтны поспех на цэнтралізаваным тэсціраванні, — папярэджвае Мікалай Фяськоў. — Для гэтага трэба, як я ўжо казаў, шмат працаваць, прычым не толькі ў выпускным класе. Але для абітурыентаў рэпетыцыйнае тэсціраванне прадастаўляе ўнікальны шанц выявіць прабелы ў ведах і крытычна сябе ацаніць. Да таго ж падчас рэпетыцыі маладыя людзі набываюць навыкі работы з тэстамі і адаптуюцца псіхалагічна...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### Вынікі ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання 2006 г. па тыпу навучальных устаноў

| Тып навучальнай установы | Беларуская мова | Руская мова | Фізіка | Матэматыка |
|---|---|---|---|---|
| | Сярэдні бал | | | |
| Ліцэй | 50,22 | 54,76 | 45,62 | 44,27 |
| Гімназія | 52,98 | 52,02 | 39,48 | 38,90 |
| Агульнаадукацыйная школа | 38,27 | 36,24 | 30,75 | 27,12 |
| Студэнты 1—2 курсаў ВНУ | 40,48 | 34,46 | 26,65 | 25,60 |
| Каледж | 33,61 | 29,57 | 25,82 | 21,44 |
| Сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова | 31,98 | 28,68 | 26,74 | 20,92 |
| Прафесійны ліцэй | 25,65 | 23,37 | 25,38 | 19,33 |
| Прафесійна-тэхнічнае вучылішча | 28,65 | 22,84 | 24,63 | 19,21 |

## ДЗЕНЬ ЗДАРОЎЯ — КОЖНУЮ ДРУГУЮ СУБОТУ

**Міністэрства адукацыі ініцыявала правядзенне шырокамаштабнай рэспубліканскай акцыі «Здаровы я — здаровая краіна», якая стартуе 1 лютага. Яна будзе доўжыцца да 2010 года. Галоўная мэта акцыі — фарміраванне ў дзяцей і моладзі патрэбы да рэгулярных заняткаў фізкультурай і спортам.**

У гэтым годзе ў рамках акцыі пройдуць рэспубліканская профільная змена «Я выбіраю здароўе» ў Нацыянальным дзіцячым аздараўленчым лагеры «Зубраня», рэспубліканскі конкурс сярод навучэнцаў ССНУ «За здаровы лад жыцця!», рэспубліканскі «зорны» паход навучэнцаў па месцах воінскай славы, кубак Рэспублікі Беларусь па спартыўнаму арыентаванню «Рух — гэта здароўе!», рэспубліканскі турыстычны злёт «Здароўю — так!» рэспубліканская спартакіяда школьнікаў, конкурс педагагічнага майстэрства работнікаў аздараўленчых лагераў «Здаровае лета!» і шэраг іншых мерапрыемстваў і конкурсаў. Вельмі важна, што да ўдзелу ў мерапрыемствах будуць прыцягвацца не толькі навучэнцы і студэнты, але і дашкольнікі, бацькі, а таксама шырокая педагагічная грамадскасць.

Дарэчы, у рамках акцыі кожная другая субота месяца ва ўстановах адукацыі будзе аб'яўлена Днём здароўя.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ГЭТА БУДУЦЬ ДОЎГІЯ «ІМГНЕННІ КУЛЬТУРЫ»

**У Мінску ў Беларускім таварыстве культурных сувязяў і дружбы з замежнымі краінамі (БелТД) адбылася ўрачыстасць з нагоды правядзення ў нашай краіне Года нямецкай культуры ў Беларусі. Яго поўная назва: «Імгненні культуры-2007: чатыры пары года нямецкай культуры».**

Гэта будзе, як вынікае з назвы, серыя разнастайных мерапрыемстваў, якія зоймуць увесь год. Так, у студзені і лютым арганізатары «імгненняў» прапаноўваюць разам з імі адчуць весялосць зімовых забаў. У прыватнасці, адбудзецца канцэрт «Скарбы сусветнай музыкі з Баварыі», пройдуць карнавал па-кёльнску і выстава нямецкай кнігі ў рамках Мінскага міжнароднага кніжнага кірмашу. Мэта конкурсу фатаграфіі і графікі — зацікавіць маладых мастакоў нямецкай культурай. Пераможца конкурсу атрымае магчымасць наведаць Германію і ўдзельнічаць у мастацкай выставе ў горадзе Касэль.

А вясной прапаноўваецца адчуць вясновую энергію абуджэння. З гэтай нагоды запланаваны трохдзённы фестываль нямецкамоўнай літаратуры. Пісьменнікі з Германіі пазнаёмяць яго ўдзельнікаў са сваімі творамі. Таксама чакаецца прыезд літаратараў з Аўстрыі і Швейцарыі. Напрыканцы фестывалю мяркуецца наладзіць рух так званага «начнога трамвая» — вандроўку па горадзе з музыкай і паэзіяй. На лета (прапаноўваецца адчуць апетытную спеласць гэтай пары года) запланаваны паказ калекцый моды маладых нямецкіх дызайнераў, міжнароднае спаборніцтва па футболу паміж юніёрскімі камандамі. Восенню, натуральна, запрашаецца адчуць яе шыкоўнае харастavailable. Так беларуская публіка зможа пазнаёміцца з дасягненнямі майстроў нямецкага тэатра, кіно, архітэктуры, сучаснай харэаграфіі.

Як адзначыў пасол ФРГ Марцін Хэкер, яго краіна збіраецца прадставіць у Беларусі нямецкую культуру і мастацтва ва ўсёй іх разнастайнасці. Будзе прапанавана вельмі насычаная праграма. На думку пасла, кантакты паміж грамадзянамі абедзвюх краін, якія знаходзяцца ў цэнтры Еўропы, з'яўляюцца сёння цеснымі як ніколі дагэтуль.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

# МОЛАДЗЬ АКТЫЎНА ЎКЛЮЧАЕЦЦА Ў ПАЛІТЫКУ



Фота БЕЛТА.

**Дэпутатамі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў розных узроўняў абраны 1470 членаў БРСМ. Гэта ў 6 разоў больш, чым у 2003 годзе — у мясцовыя Саветы дэпутатаў 24-га склікання. З іх 17 чалавек увайшлі ў склад абласных і Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, 360 — у раённыя, 45 — у гарадскія, 1050 — у пасялковыя Саветы дэпутатаў.**

— Вынікі выбараў нас вельмі ўзрадавалі. Яны паказалі, што Беларускі саюз моладзі бачыць сябе ўдзельнікам вырашэння не толькі пытанняў маладзёжнай палітыкі, але і сацыяльна-эканамічных праблем у рэгіёнах, — заўважыў на прэс-канферэнцыі, прысвечанай удзелу ў выбарах грамадскага аб'яднання «БРСМ» першы сакратар арганізацыі Леанід Кавалёў. — Сёння члены нашай арганізацыі — гэта ў большасці сваёй маладыя людзі з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, з ідэямі ў галовах. Яны гатовыя генерыраваць, і самае галоўнае — рэалізоўваць праекты, якія накіраваны на паляпшэнне якасці жыцця, на вырашэнне канкрэтных праблем. І тое, што на 1582 мясцовыя Саветы прыходзіцца 1470 дэпутатаў — членаў БРСМ, паказвае, наколькі вялікі аўтарытэт арганізацыі і яе падтрымка сярод насельніцтва, які высокі давер аказаны маладым, і канешне, гэта — аванс, які нам яшчэ трэба будзе апраўдаць.

Вынікі выбараў таксама кажуць і пра больш актыўны ўдзел у палітычным жыцці краіны маладога пакалення. У апошняй выбарчай кампаніі працавалі 11 777 актывістаў Саюза моладзі. У якасці назіральнікаў — 5989 чалавек (у 2003-м — 1000), у складзе акруговых выбарчых камісій — 338 членаў БРСМ (у 2003 годзе — 196), у складзе ўчастковых выбарчых камісій — 3504 члены БРСМ і 481 (у 2003 годзе — 110) — у складзе тэрытарыяльных выбарчых камісій. Амаль 50 000 маладых людзей узялі ўдзел у акцыі «Моладзь выбірае!», якую правёў Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

У агульнай колькасці абраных дэпутатаў прадстаўнікі БРСМ складаюць 7 працэнтаў.

— Гэта дазволіць нам адстойваць інтарэсы моладзі ў цэлым па краіне і на месцах, — падкрэсліў Леанід Кавалёў. — І галоўнае, на што мы акцэнтуем увагу, — канкрэтная праца па вырашэнню задач, якія ставіць перад імі і кіраўніцтва арганізацыі і само жыццё, людзі, якія за іх прагаласавалі.

Цэнтральны камітэт плануе з сакавіка распачаць работу з дэпутатамі — прадстаўнікамі БРСМ. Спачатку ў Мінск, у парламент, будуць запрошаны дэпутаты абласных, раённых і гарадскіх Саветаў. Тут яны пройдуць своеасаблівую школу дэпутацкай работы, змогуць задаць свае пытанні, выступіць з прапановамі і абмеркаваць праблемы з членамі парламента, прадстаўнікамі міністэрстваў і ведамстваў.

Потым гэтыя маладыя людзі правядуць падобную вучобу і сустрэчы з дэпутатамі пасялковых саветаў. Так будзе выбудавана вертыкаль ад парламента да сельскіх Саветаў. Мець добрую выбарчую праграму і чулае сэрца дэпутату недастаткова, лічыць кіраўніцтва маладзёжнай арганізацыі, трэба яшчэ здолець увасобіць задуманае і абяцанае, ведаць механізм ажыццяўлення сваіх намераў. Цэнтральны камітэт бачыць сваю задачу ў тым, каб забяспечыць гэтым механізмам дэпутатаў ад Саюза моладзі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ФОРМУЛА ПОСПЕХУ — РАЎНАВАГА ЗНЕШНЯЙ І ЎНУТРАНАЙ ПРЫГАЖОСЦІ

**17 студзеня ў Нью-Йорку пятнаццацігадовая беларуска Вікторыя Махота заняла другое месца ў прэстыжным конкурсе «Супермадэль свету».**

У гэтым конкурсе Беларусь удзельнічае толькі другі раз — і другі раз запар прыгажосць беларускіх дзяўчат заваёўвае планету. Летась мінчанка Каця Даманькова стала першай у свеце супермадэллю, апярэдзіўшы саперніц з трыццаці васьмі краін свету. А школьніца з Мінска Вікторыя Махота абышла ўдзельніц ужо з сарака пяці краін і заняла высокае другое месца.

Вікторыі ўсяго 15 (яна вучыцца ў СШ № 79 г. Мінска), і менавіта гэта галоўная прычына таго, што ёй прысудзілі толькі другое, а не першае месца, якое заняла мадэль з Нідэрландаў. За ўсю шматгадовую гісторыю конкурсу адна і тая ж краіна ні разу не выйгравала два разы. Аб тым, як беларускам удаецца быць на вяршыні мадэльнага бізнэсу і што для гэтага трэба рабіць, з чытачамі падзялілася Вікторыя Махота.

**— Віка, як ты ўвогуле трапіла на гэты конкурс?**

— Выпадкова. Я ведала, што па Беларусі праходзяць адборачныя туры для прэстыжнага конкурсу «Супермадэль свету», аднак удзельнічаць у іх нават і не збіралася. А мая мама, наадварот, вельмі хацела, каб я сябе паспрабавала ў гэтым адборы. А аднойчы я праспала першы ўрок, што здараецца вельмі рэдка, і вырашыла ўжо застацца дома, на што мама катэгарычна сказала: «Ніякага спаць — збірайся на кастынг». І літаральна за руку прывяла мяне на яго. Там было вельмі шмат дзяўчат і, скажу шчыра, раней я думала, што я самая высокая не толькі ў класе. Аднак калі я прыйшла туды, то зразумела, што я яшчэ зусім невысокая і што да звання «высокая» мне яшчэ расці і расці. Калі я ўбачыла, колькі людзей хоча прайсці кастынг, то мне ўжо самой стала цікава паўдзельнічаць ва ўсім гэтым праекце.

**— Дагэтуль ты займалася ў якім-небудзь мадэльным агенцтве?**

— Не. Канешне, да мяне часта падыходзілі на вуліцы прадстаўнікі розных агенцтваў, якія запрашалі прыйсці менавіта да іх. Аднак візітоўкі я адразу ж выкідвала. Толькі аднойчы я згадзілася і прыйшла ў адно з агенцтваў, аднак з дня ў дзень там было адно і тое ж, мне надакучыла і праз тыдзень я гэту справу кінула. На кастынгу мне сказалі, што я прайшла ў другі тур, у якім прымуць удзел самыя лепшыя, на думку журы, дзяўчынкі з усёй Беларусі, якія маглі б дастойна прадставіць нашу краіну на такім прэстыжным конкурсе, як «Супермадэль свету». Пасля гэтага падзеі пачалі развівацца так хутка, што ўжо нават і не веру, што за такі кароткі час са мной столькі ўсяго адбылося.

**— Скажы шчыра, ці разлічвала ты на перамогу?**

— Канешне, я вельмі хацела заняць якое-небудзь высокае месца. Аднак калі мы прыляцелі ў Нью-Йорк, я прыгледзелася да ўсіх дзяўчат і ўжо сама для сабе зрабіла выснову, што ў пяцёрку я ўвайсці павінна дакладна. Мне вельмі спадабалася дзяўчынка з Аўстраліі, вельмі прыгожая. Шмат прыгожых дзяўчат было з усходняй знешнасцю. На самім конкурсе было два выхады: у вольным стылі і ў вячэрнім уборы. Калі аб'яўлялі месцы, то пачуццё ўпэўненасці ў сабе мяне ўвогуле пакінула. Думала, што «праляцела». У душы ўжо з гэтым змірылася. А калі пачула, што заняла другое месца, вельмі абрадавалася. А галандку, якая стала супермадэллю свету, на рэпетыцыях увогуле не было ні відаць, ні чуваць.

**— Значыць, другім месцам ты засталася задаволена?**

— Вядома, мне, як і любой удзельніцы, хацелася б стаць супермадэллю нумар адзін, аднак пазбавіўшыся ўсіх суб'ектыўных пачуццяў я разумею, што мне і гадоў малавата, каб такой звацца. Аднак другое месца — гэта ж выдатны вынік! Мне асабліва прыемна, што ў мадэльным бізнэсе, як і ў дзіцячым «Еўрабачанні» мы, падрастаючае пакаленне Беларусі, прадстаўляем нашу краіну на самым высокім узроўні. І яшчэ я б вельмі хацела, каб і наступная прадстаўніца ад Беларусі заняла таксама высокае месца — не трэцяе, а зноў — першае.

**— Былі якія-небудзь непрыемнасці з сукенкамі ці абуткам перад конкурсам?**

— Нічога такога не было. Нейкі выдуманы стэрэатып, што мадэлі падстройваюць сваім саперніцам нейкія непрыемнасці. У нас усё прайшло добра. Намнога складаней было на фінальным туры, які праходзіў у Палацы Рэспублікі. Там была сцэна, якую для дэфіле горш не прыдумаеш — акрамя таго, што яна зроблена з нейкага вельмі слізкага матэрыялу, дык у яе яшчэ і падсветка была. Што датычыцца непасрэдна конкурсу, то адносіны паміж усімі былі вельмі цёплыя. Больш таго, усе былі вельмі добразычлівыя адна да адной. Я пасябравала з прадстаўніцамі Расіі, Украіны і Казахстана. З іншымі ўсталяваць сяброўскія адносіны было цяжкавата па прычыне моўнага бар'еру. Зараз я ўспамінаю ўсіх іх вельмі добра і нічога дрэннага ні пра каго сказаць не магу.

**— У цябе быў час, каб пазнаёміцца з горадам?**

— Кожны дзень перад конкурсам мы займаліся дэфіле, фотасесіяй, прымеркай адзення. І паглядзець горад да конкурсу было практычна немагчыма. Але пасля конкурсу ў мяне было трошкі часу, каб пагуляць па горадзе. Хачу сказаць, што Нью-Йорк мяне вельмі ўразіў: там столькі небаскробаў, я была на 86-м паверсе — горад як на далоні. А яшчэ там, у адрозненне ад нас, зусім няма двароў. Рытм жыцця там зусім іншы, чым у нас, там усе кудысьці бягуць, спяшаюцца. Не ведаю, ці змагла б я жыць у такім горадзе, але першае ўражанне ад горада засталося вельмі яркім і незабыўным.

**— Хто быў першы, каму ты расказала аб сваёй перамозе?**

— У першую чаргу патэлефанавала, канешне ж, маме. Але гэта было чатыры гадзіны ночы і мама на мае радасныя словы толькі сонна адказвала: «Так, так, добра». Але потым, калі яна зразумела, пра што я ёй кажу, то, безумоўна, была шчаслівей за мяне. Больш нікому асабліва не тэлефанавала, бо былі праблемы з мабільным тэлефонам, я яго ніяк не магла падзарадзіць, бо там зусім іншыя разеткі.

**— Каб падтрымліваць фігуру, ты абмяжоўваеш сябе ў салодкім?**

— Не. Напрыклад, у Амерыцы я проста аб'ядалася піцай, там у рэстаранах яе відаў дваццаць, напэўна. А арганізатары конкурсу нас травой некай спрабавалі карміць, вельмі падобнай на наш падарожнік. Але, канешне, мне за фігурай трэба будзе сачыць вельмі пільна, бо ва ўмовах кантракта, які я падпісала, вельмі ясна сказана, што мадэль не павінна папраўляцца, інакш кантракт адразу абнулююць.

**— Ад Каці Даманьковай перад конкурсам якія-небудзь парады атрымлівала?**

— Я гутарыла з ёй. Яна мне казала, каб я не хвалявалася, бо гэта зусім не страшна. Аднак я ўсё роўна баялася. Зараз разумею, што і, сапраўды, для страху не было прычыны. Я і наступнай удзельніцы ад Беларусі буду казаць тое ж самае, каб яна не хвалявалася, аднак упэўнена, што словы мала чым дапамогуць — гэта трэба перажыць самому, каб перастаць хвалявацца.

**— Як цябе сустрэлі твае аднакласнікі?**

— Сустрэлі вельмі добра. Яшчэ ў Амерыцы мяне павіншавала беларускае пасольства. Сказалі, што мяне будуць сустракаць на радзіме не толькі родныя, але і прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі. Я думала, што будзе максімум чалавек дзесяць. Аднак калі прыляцела, нават разгубілася ад той колькасці людзей, якая сабралася ў аэрапорце. Прыехалі не толькі аднакласнікі, але і з паралельных і старэйшых класаў, класны кіраўнік. Мне падарылі шмат кветак і мяккіх цацак. Было вельмі прыемна. Хачу сказаць усім вялікі дзякуй за такую цёплую сустрэчу.

**— Якія твае далейшыя планы?**

— Я хачу скончыць спачатку дзевяць класаў, а потым, калі гэта будзе магчыма, скончыць экстэрнам і сярэднюю школу. У будучым вельмі б хацела стаць урачом, як і мая бабуля. Аднак ведаю, што ў медуніверсітэт вельмі складана і паступіць, і вучыцца там. Што датычыцца мадэльнай кар'еры, то ў хуткім часе я палячу ў Парыж на «Тыдзень высокай моды», а калі мне споўніцца 16 гадоў, то буду працаваць тры гады ў Нью-Йорку па кантракту з сусветнавядомым мадэльным агенцтвам «Ford Models». Каця Даманькова кажа, што сумяшчаць вучобу і работу амаль што немагчыма, аднак я буду старацца рабіць усё неабходнае, каб стаць не толькі добрай мадэллю, але і выдатным спецыялістам у якой-небудзь справе.

**— Што б ты пажадала дзяўчынкам, якія збяруцца ўдзельнічаць у адборачных турах у наступным годзе?**

— Хачу пажадаць упэўненасці ў сабе. Не ўпускайце свой шанц. Верце ў свае сілы і сачыце не толькі за знешняй, але і за ўнутранай сваёй прыгажосцю.



**Марына ДЗМІТРЫЕВА.**

# СТЫПЕНДЫЯ — СТУДЭНЦКАЕ СВЯТА,

## альбо Спажывецкі кошык студэнта

**Указ Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі аб павелічэнні памераў усіх відаў дзяржаўных стыпендый моладзі, якая вучыцца, даў магчымасць павялічыць памеры навучальных стыпендый для студэнтаў ВНУ на 3,9—6,3 тысячы рублёў. Гэта сведчыць аб сацыяльнай падтрымцы будучых кадраў краіны.**

**Дарэчы, у многіх краінах не існуе студэнцкіх стыпендый у нашым разуменні. Напрыклад, у Германіі стыпендыя выплачваецца толькі маладым людзям, прыбытак сям'і якіх знаходзіцца ніжэй пражытковага мінімуму. Разам з тым 50 працэнтаў сумы, якую студэнт атрымаў, плюс 9 працэнтаў гадавых давядзецца вяртаць у банк пасля заканчэння вучобы. Таму нядзіўна, што многія адмаўляюцца ад падобнай дапамогі і лічаць, што беларускім студэнтам грэх скардзіцца.**

**А вось што думаюць наконт гэтага самі беларускія студэнты.**

**Косця, БДУ, 4-ы курс:**

— Грошай ніколі шмат не бывае, асабліва ў студэнта. Але і студэнты розныя бываюць. Адны харчуюцца ў рэстаране, іншыя перабіваюцца на пярлоўцы. Таксама вялікае значэнне мае тое, жыве студэнт з бацькамі ці не. Я мінчанін, таму частку стыпендыі кожны месяц адкладваю, каб на канікулах паехаць у падарожжа, паглядзець свет. Акрамя гэтага, наведваю спартыўную секцыю, якая таксама патрабуе выдаткаў.

**Дзіма, БНТУ, 3-і курс:**

— Жыву я ў інтэрнаце. Таму кожны месяц з маёй стыпендыі вылічваюць грошы за пражыванне. Канешне, за сто тысяч беларускіх рублёў нічога грандыёзнага я купіць не магу. Без бацькоўскай падтрымкі, безумоўна, давودзілася б цяжкавата. Пакуль вучылі мяне аднаго, было лягчэй, а зараз і брат паступіў. Таму я стараюся падпрацоўваць грузчыкам. Складана, але лішняя капейка не перашкодзіць.

Думаю, што можна пражыць на стыпендыю, калі абмежавацца толькі ежай, сном і вучобай. Бо, каб, напрыклад, схадзіць у кіно, трэба аддаць 6 тысяч рублёў. Гэта аднаму, а калі дзяўчыну, якая падабаецца, запрасіць...

**Света, БДУ, 3-і курс:**

— Я, напрыклад, задаволена дзяржаўнай падтрымкай. У дадатак да стыпендыі мне час ад часу выплачваюць прэміі. Бо я з'яўляюся старастай і сакратаром БРСМ факультэта. Гэтыя грошы разыходзяцца на падарункі сябрам, ежу (я жыву ў інтэрнаце, а з дому харчоў на цэлы месяц, безумоўна, не прывязеш), праязны білет, толькі 30 тысяч трэба аддаць, каб з'ездзіць дадому і назад.

**Іра, БДУ, 4-ы курс:**

— Я не атрымліваю стыпендыі. Грошы на жыццё выдзяляюць бацькі. Рузумею, што ім нялёгка: трэба ж яшчэ і за вучобу немалую суму плаціць.Таму я і пайшла працаваць рэкламным агентам. Хочацца быць незалежнай. Так прыемна сказаць маці, што на кішэнныя выдаткі я зарабіла сама.

Як бачыце, ступень задаволенасці студэнта залежыць ад многіх фактараў. А вось памер стыпендыі толькі ад аднаго: сярэдняга бала ў залікоўцы. Чым ён большы, тым большую суму грошай атрымае студэнт.

Напэўна, не ўсе ведаюць, што, акрамя звычайных стыпендый, маюцца яшчэ і прэзідэнцкія, імянныя і стыпендыі Нацыянальнага банка. Яны прызначаюцца студэнтам, пачынаючы з трэцяга курса. Для таго, каб стаць уладальнікам прэзідэнцкай стыпендыі, трэба мець толькі «дзявяткі» і «дзесяткі» за ўсе курсы навучання, каб атрымаць імянную стыпендыю — такія ж адзнакі за апошнія чатыры семестры. Стыпендыю Нацыянальнага банка могуць атрымаць толькі студэнты эканамічнага факультэта і факультэта міжнародных адносінаў. Асноўная ўмова — «дзевяткі» і «дзесяткі» ў залікоўцы за апошнія два семестры. Паводле слоў метадыста галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай працы БДУ Юліі Цвірко, раней такія стыпендыі давалі ў асноўным пяцікурснікам, цяпер, з увядзеннем дзесяцібальнай сістэмы ацэнкі ведаў, іх выдаюць і студэнтам чацвёртага курса.

Для поўнай карціны прадстаўляю вашай увазе вынікі апытання, праведзеныя на сайце факультэтата журналістыкі БДУ. У ім прынялі ўдзел 123 студэнты.

***Атрымаўшы стыпендыю, вы...***

выдаткоўваеце яе на ежу, адзенне — 26 чалавек;
купляеце дыскі, касеты, кнігі — 16;
дорыце падарункі блізкім — 6;
страчваеце на забавы — 21;
вяртаеце даўгі — 10;
адкладваеце грошы — 13;
а мне яе не плацяць — 31.

Усе студэнты-бюджэтнікі лічаць дні да наступнай стыпендыі. Асабліва тыя, якія нідзе не падпрацоўваюць. Але, незалежна ад памеру дзяржаўнай дапамогі, ва ўсе часы, упэўнена, парты у лекцыйнай зале будуць «упрыгожваць» словы накшталт гэтых:

*Хутчэй бы дадому,*
*Ну хоць на хвілінку,*
*Каб чорнага хлеба*
*Згрызці скарынку.*

Як бачыце, студэнцкае пачуццё гумару не мае межаў і знаходзіць адлюстраванне нават у праблеме хлеба надзённага і матэрыяльных даброт. Канешне, згаджуся, што на студэнцкую стыпендыю ў сталіцы пражыць немагчыма. Але тая матэрыяльная падтрымка, якую аказвае дзяржава штомесяц, бясспрэчна, не толькі з'яўляецца стымулам для вучобы, але і дае значную палёгку бацькам.

**Надзея ДРЫЛА.**

# Жанчына, якая «зоркаю свеціцца»

Сучаснікі

**У народнай артысткі Беларусі, вядучага майстра сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Святланы Акружной сёння юбілей. Святлана Арцёмаўна вядома не толькі як выдатная актрыса: яна яшчэ і палітык — намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.**

Упершыню я ўбачыў яе на сцэне, калі яшчэ вучыўся ў школе, у 1990-я, калі працаваў у рэгіянальнай газеце, пазнаёміліся асабіста. За тыя гады, што я ведаю Святлану Арцёмаўну, яна знешне наогул не змянілася: заўсёды энергічная, абаяльная, Жанчына з вялікай літары. Кожны раз пры сустрэчы шчыра цікавіцца асабістымі справамі, што двойчы прыемна, вельмі паважае нашу з вамі «Звязду».



Фота БЕЛТА.

«З цягам часу я зразумела, што тэатр не варты таго, каб дзеля яго ахвяраваць сям'ёй, дзецьмі, жыццём. Усё імгненна, усё мінае... І ўсё ж тэатр — гэта маё жыццё, маё прызванне, маё прызначэнне, мой боль, трагедыя і любоў», — так яна разважае аб любімай справе, якой служыць ужо 40 гадоў.

Святлана Акружная працуе ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа з 1969 года, пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. Выдатная прафесійная падрыхтоўка, высокая сцэнічная культура, працавітасць, творчая ініцыятыва дазволілі ёй заняць вядучае месца ў «коласаўскай» трупе. Нават самыя першыя яе работы — Анютка («Улада цемры» Л. Талстога), Чацвяртак («А давіткі тут ціхія» Б. Васільева), Інга, Зізі («Салаўіная ноч» В. Яжова), Дачка («Зацюканы апостал» А. Макаёнка) звярнулі на сябе ўвагу крытыкі і тэатральнай грамадскасці. За выкананне ролі Франкі ў спектаклі «Хам» паводле Э. Ажэшкі ўдастоена прэміі прафсаюзаў Беларусі і Дыплома «За лепшую жаночую ролю» на міжнародным тэатральным фестывалі ў Бранску...

Найбольш значныя работы апошніх сезонаў сведчаць пра няспынны прафесійны рост акцёрскага майстэрства Святланы Акружной. Сярод іх: Дорыс («Палюбоўнікі з Каліфорніі» Б. Слэйда), Эліна Макропулас («Рэцэпт Макропуласа» К. Чапека), Жанна (« Жанна» паводле «Жаваранка» Ж. Ануя), Мадам («Марлен... Марлен...» Д. Мінчонка), Кацярына Іванаўна («Кацярына Іванаўна» Л. Андрэева), Лаура («Бацька» А. Стрындберга»).

Святлана Арцёмаўна ўдастоена дыпломаў «За лепшую жаночую ролю» на міжнародных фестывалях «Славянскія тэатральныя сустрэчы» (у 2003-м — за ролю Кацярыны Іванаўны ў аднайменным спектаклі) і «Белая вежа» (у 2004-м за ролю Лауры ў спектаклі «Бацька»).

Акружная арганізавала паездкі творчых груп коласаўскага тэатра на міжнародны тэатральны фестываль у г. Трабзон (Турцыя) у 2004-м і 2005-м, дзе таксама высока былі адзначаны крытыкамі яе работы. Здымаецца актрыса ў кіно. Найбольш папулярныя кінаработы з яе ўдзелам «Другая восень», «Зацюканы апостал», «Плач перапёлкі»... У 1997-м была ўзнагароджана медалём Францыска Скарыны.

У 2000-м выбрана, а ў 2004-м перавыбрана на новы тэрмін у Савет Рэспублікі. Лаўрэат прэмій «За духоўнае адраджэнне» (2006 г.), і «За мацярынскую мужнасць» імя З. Тусналобавай-Марчанкі. У 1997—1998 гадах атрымала тытул «Жанчына года» (Кембрыдж, Англія), у 2005-м удастоена міжнароднай «Прэміі міру» (ЗША) і прэміі «За духоўнае адраджэнне».

Вось што пішуць аб рабоце Акружной на сцэне эксперты. Вольга Скорачкіна (тэатразнаўца з Санкт-Пецярбурга): «Святлана Акружная — адна з самых прыгожых, загадкавых, элегантных актрыс беларускай сцэны... Па ўсіх прыкметах яна — «блакітная зорка», якая ведае таямніцы і правілы «свячэння»... Заслужаны дзеяч мастацтваў Украіны Барыс Эрын: «Я падхопліваю кімсьці сказанае аб ёй: «зоркаю свеціцца». Веру!..» Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Сямён Казіміроўскі: «Яна актрыса на ўсе часы. Мару аб тым, каб рэжысёры зразумелі, што такія кветкі прырода нараджае не часта...»

У рэпертуарным лісце Акружной — каля 50 спектакляў. 25 студзеня ў Оршы ў ДК чыгуначнікаў у выязным спектаклі «Бацька» яна зноў паказала ўсё сваё майстэрства. Дарэчы, гэта яе праект, а паставіў спектакль мастацкі кіраўнік тэатра імя Я. Коласа Віталь Баркоўскі. А ў маі пройдзе яе бенефіс, гледачы ўбачаць прэм'еру спектакля «Васа Жалязнова» М. Горкага, які ставіць Рыд Таліпаў. Галоўную ролю выканае Акружная. Многія тэатралы, дарэчы спецыяльна ходзяць у тэатр «на Акружную». Калегі шчыра віншуюць Святлану Арцёмаўну з юбілеем. «Звяздоўцы» далучаюцца да віншаванняў. Здароўя Вам, новых вышынь у творчасці!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### САПЕРНІК ДАПАМАГАЕ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ

Мінскі манеж ужо амаль гатовы прыняць матч 1/8 розыгрышу Кубка Дэвіса, дзе з 9 па 11 лютага беларускія тэнісісты згуляюць са шведамі (устанаўліваюцца трыбуны, кладзецца новае пакрыццё). Білеты коштам ад 30 да 100 тысяч рублёў паступаюць у продаж. Цікава, што лідар нашай каманды Максім Мірны рыхтаваўся да турніру ў пары са сваім сапернікам, шведам Йонасам Б'ёркманам на Адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі.

# Цэнтр для дзяцей пабудуюць ірландцы

**Дабрачынная арганізацыя «Дзеці Чарнобыля» з Ірландыі пабудуе ў райцэнтры Горкі дзіцячы сацыяльна-педагагічны цэнтр.**

Ірландскія дабрачыннікі супрацоўнічаюць з Горацкім раёнам некалькі гадоў. Спачатку яны дасылалі гуманітарную дапамогу — адзенне, абутак і харчаванне, а потым сталі дапамагаць раёну ў рамонце будынкаў дзіцячага сацыяльнага прытулку ў вёсцы Стараселле і ў Горках. І не проста выдаткоўвалі грошы, а прывозілі будаўнічыя матэрыялы і самі працавалі на аб'ектах. Цяпер ірландцы прапанавалі пабудаваць у Горках сацыяльна-педагагічны цэнтр, аб'яднаны з цэнтрам для карэкцыйнага развіцця, навучання і рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў.

У Горках ужо абралі зямельны ўчастак непадалёк ад гарадскога стадыёна. Тэхнічныя ўмовы будуць дасланы ў Ірландыю, дзе зробяць арыгінальны праект будынка, які, тым не менш, пройдзе беларускую экспертызу. Будаўніцтва поўнасцю будуць весці ірландцы, а Горацкі райвыканкам, са свайго боку, гатовы ў выпадку неабходнасці прадаставіць тэхнічную дапамогу. Плануецца, што цэнтр для дзяцей будзе ўзведзены за 15 тыдняў.

**Ілона ІВАНОВА.**

# Белсцэніроўка,

## або Маладыя дух для нашага тэатра

***Калі малады мастак улюбёны ў тэатр, то з яго верагодна атрымаецца добры сцэнограф. Прафесія штучная і вельмі загадкавая — яшчэ задоўга да таго, як будучы спектакль пабачаць гледачы, мастак-сцэнограф можа ўявіць, як ён будзе глядзецца на сцэне. Нават намаляваць гэта. Альбо зрабіць макет. Прыкладна так, як на выставе маладых сцэнографаў, прысвечанай 50-годдзю беларускай школы сцэнаграфіі, якая адкрылася ў тэатры імя Янкі Купалы.***

Напэўна, для многіх тэатралаў гэтую школу сёння ўвасабляе Барыс Герлаван. Прычым не толькі як мастак многіх выдатных спектакляў таго ж Купалаўскага тэатра, а яшчэ і як настаўнік. Менавіта яго вучні, выпускнікі аддзялення тэатральна-дэкарацыйнага жывапісу Акадэміі мастацтваў, на выставу прадставілі свае эскізы дэкарацый і касцюмаў да спектакляў. Выбар твораў, да якіх прыдумалі ўвасабленне маладыя мастакі, уражвае: Валянціна Праўдзіна працавала над купалаўскімі «Прымакамі», Ігар Анісенка абраў «Раскіданае гняздо», Марына Цімафеева — «Дзікае паляванне караля Стаха», Вольга Мацкевіч прыдумала сцэнаграфію да спектакля «Той самы Мюнхгаўзен», Лія Станэвічутэ — да балета «Дон Кіхот», Пятро Дзмітрыеў да оперы «Барыс Гадуноў». Колькі спектакляў адразу можна ўявіць на адной выставе!

Можна было б сказаць, што для іх гэта толькі пачатак, а наперадзе — вялікая творчая біяграфія. Варта толькі кожнаму знайсці сваю тэму і рабіць адкрыцці для сябе і для нас. Але гэтыя адкрыцці мы ўжо маглі назіраць. Таму што многія з выпускнікоў гэтага курса Герлавана ўжо працавалі з тэатрамі як мастакі і адчулі розніцу паміж марамі і рэальнай творчасцю. Ды толькі ўсё роўна без мараў, ідэй і надзей —якая творчасць? Пра гэта разважаюць удзельнікі выставы.

**Марына ЦІМАФЕЕВА, якую тэатралы ведаюць па сцэнаграфіі да наватарскага спектакля «Майстар і Маргарыта» Новага тэатра:**

— Барыс Федасеевіч — добры педагог, вельмі моцны. Я лічу, што дзякуючы аснове, якую ён нам даў, мы зробім яшчэ шмат цікавага. Ён выкладаў з энтузіязмам, з класічным падыходам. Але гэта той фундамент, на якім добра рабіць і сучасныя рэчы. Канешне, нашу працу нельга аддзяліць ад вытворчасці, калі казаць груба. Калі яе бачыш на сцэне —гэта зусім іншае, чым у макеце. Сёння складана знаходзіць новыя ідэі, але мы шукаем. Нават разумеючы, што некаторыя тэатры абмежаваныя ў сродках. Але мы імкнёмся ў нашых тэатральных умовах рабіць новыя рэчы. Я думаю, тэатрам патрэбны новыя ідэі, свежы подых.

**— Чаму для дыпломнай работы вы вырашылі абраць менавіта твор Караткевіча?**

— Я лічу, што Караткевіч — гэта вельмі глыбокі матэрыял. Гэтая тэма для мяне не была ні спантаннай, ні навязанай кімсьці. Гэта маё асабістае стаўленне да беларускай літаратуры і яе класікаў.

**Ігар АНІСЕНКА, якога ўжо ведаюць прыхільнікі Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, дзе ён працуе як сцэнограф:**

— Я не шкадую, што выбраў гэты шлях, хоць ішоў да яго доўга і настойліва. Праца сцэнографа вельмі цікавая: тут ты можаш адчуваць сябе і архітэктарам, і дызайнерам касцюмаў, мэблі, і дадаць да ўсяго гэтага жывапіс —сапраўдны сінтэз розных мастацтваў. Маёй самай удалай працай на сёння лічу сцэнаграфію да спектакля паводле Мальера «Кабала святош», але касцюмы да яго рабіла Алёна Ігруша. Там знойдзены цікавы ход, усё зроблена ў адзіным стылі, мне не сорамна за гэтую работу.

**— Ваша дыпломная работа напоўнена беларускім духам —яна беларуская нават па колерах...**

— Я абраў беларускую тэму, таму што яе адчуваю. Я вельмі люблю вёску, разумею яе. У гэтай тэме я плаваю свабодна, таму і «Раскіданае гняздо». Мне было цікава перадаць беларускі дух у спектаклі «Трыбунал», які наш тэатр стварыў разам з Іркуцкім тэатрам. Мы рабілі найперш для беларусаў, якія жывуць у Сібіры. Гэты спектакль і цяпер там ідзе. Але каб гэты спектакль зразумелі і рускія людзі, трэба было прыдумаць нейкі вобраз. У нас цэнтральным аб'ектам сцэнаграфіі сталі жорны. Як жыццё —яно ўсё перамеле...

***Маладыя мастакі пачынаюць сваё творчае жыццё з выдатнай падзеі — выставы. Кажуць, што пачынаць цяжка. Але ідэй хапае! Няхай іх рэалізацыя патрабуе грошай, няхай не заўсёды гэтыя грошы можна лёгка знайсці. Яны ж — творцы. Значыць — нават прымітыўнымі сродкамі могуць зрабіць нешта цікавае.***

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

«Мужнае» здароўе

# ПЕРАМАГАЕ ТОЛЬКІ АДЗІН

**Старажытная філасофія пошуку радасці, а не задавальнення чамусьці не «працуе» сёння. Спецыялісты мяркуюць, што дрэнную паслугу ў няправільным светаўспрыманні аказваюць у тым ліку СМІ. Сапраўды, іх прадстаўнікам удалося «раздзьмуць» пытанне магчымасці атрымання задавальнення з дапамогай сэксу, а гэта балюча ўдарыла па гарманічных адносінах паміж жанчынай і мужчынам, па жаданню ствараць шлюб, планаваць сям'ю, клапаціцца пра сваё здароўе, каб нараджаць здаровых нашчадкаў. Прадметам сённяшняй гутаркі стануць мужчыны, размова пра іх месца і ролю ў справе рэпрадукцыі. Хоць пачаць размову хочацца ўсё роўна з жанчын. А раптам сучасныя матулі страцілі асновы правільнага выхавання сыноў? Адказвае загадчык кафедрай уралогіі і нефралогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Аркадзь ГРЭСЬ.**

— Абодвух бацькоў складана абвінавачваць у нейкіх памылках выхавання. Амаль заўсёды яны паводзяць сябе правільна. Аднак варта памятаць, што самае важнае ў выхаванні хлопчыкаў — прысутнасць у яго жыцці мужчыны, бацькі. Гэта ўплывае на характар, не дазваляе стаць жаноцкім, з прыкметамі нарцысізму і жаданнем упрыгожвацца.

**— А «злоўжыванне» памперсамі — не памылка з пункту гледжання здароўя будучага мужчыны?**

— Памперсы — добрая рэч, калі трэба ісці на прагулку, у паліклініку... А пастаяннае іх выкарыстанне можа быць шкодным перш-наперш з-за скарачэння кантактаў маленькага чалавечка, які ўспрымае навакольны свет літаральна толькі праз пачуццё дотыку. Калі маці паднімаецца ноччу, уключае святло, штосьці гаворыць дзіцяці, пераапранае яго, дзіця набывае пачуццё абароненасці. Сярод дзяцей, якім удзялялі належную ўвагу, менш злачынцаў, яны больш душэўныя і адкрытыя. Акрамя псіхалагічнага, ёсць і іншы аспект. Памперс — гэта залішняя цеплыня для мужчынскіх органаў. А лішак цеплыні спрыяе расслабленню вен і мышцаў.

**— Ёсць аптымальны час пачатку палавога жыцця для мужчыны?**

— Аптымальны тэрмін пачатку палавога жыцця надыходзіць пасля палавога выспявання, якое назіраецца, дарэчы, у сучасных хлопчыкаў крыху пазней, чым нейкі час таму. Прыцягненне сродкамі масавай інфармацыі надзвычайнай увагі да сэксу правакуе ўзнікненне ў клінічнай практыцы выпадкаў, калі дзяўчынкі маюць палавыя кантакты яшчэ да ўстанаўлення менструальнага цыкла, а хлопчыкі — да надыходу палавога выспявання, раней за 14—16 гадоў. Не думаю, што для няспелага арганізма карысная сэксуальная нагрузка.

**— Устрыманне ад палавога жыцця мае адмоўны бок для маладога чалавека?**

— Гэта выключна маральны аспект. Адсутнасць сэксу не аказвае адмоўнага ўздзеяння на арганізм маладога чалавека. Вядомыя выпадкі, калі, напрыклад, рускія рыбакі па году жылі без жанчын, вярталіся дадому і нараджалі дзяцей.

**— Ад чаго ж у мужчыны залежыць працягласць сэксуальнага жыцця, рэпрадуктыўнай функцыі?**

— У жанчын дзетародны ўзрост абмежаваны колькасцю менструацый, пры якіх можа адбыцца зачацце, а для мужчын абмежаванняў не існуе: ён здольны да дзетараджэння і ў 20 гадоў, і ў 70 гадоў. Праўда, не 100 працэнтаў мужчын. І тут мае значэнне генетычная «схільнасць». Тым не менш, чым даўжэй захоўваецца сэксуальнае жыццё, тым пазней надыходзіць яго завяршэнне. Нормы па інтэнсіўнасці палавога жыцця не існуе. У кожнага яна свая, важна толькі прытрымлівацца яе, прычым так, каб муж і жонка, у якіх гэтая норма можа быць рознай, не адчувалі дыскамфорту. На працягласці сэксуальнай актыўнасці адбіваюцца і ўмовы пражывання, уплыў навакольнага асяроддзя, стрэсы, злоўжыванне алкаголем, курэнне і іншае.

**— Дарэчы, якім чынам на якасць семяннной вадкасці ўплываюць моцнаградусныя напоі і тытунь?**

— Для магчымасці зачацця патрабуецца не меней за 40 працэнтаў актыўных, рухомых сперматазоідаў. Астатнія могуць быць маларухомымі ці нерухомымі. Усе сперматазоіды з'яўляюцца носьбітамі генетычнага матэрыялу, аднак толькі актыўныя, а дакладней, выключна адзін здольны данесці яе да яйцаклеткі. А пад уздзеяннем алкаголю колькасць актыўна рухомых змяншаецца. Нездарма маладым на вяселлі не дазваляецца ўжываць нават шампанскае. І наогул 80 працэнтаў зачаццяў адбываецца ў першы месяц сумеснага жыцця.

**— Тым не менш, якраз пітушчыя людзі вылучаюцца часам шматдзетнасцю...**

— Па-першае, колькасць актыўных сперматазоідаў зніжаецца пад уздзеяннем алкаголю, але я не сказаў, што яны знікаюць увогуле. Па-другое, здараецца нярэдка і так: хто моцна нечага жадае, у таго нічога не атрымліваецца і наадварот. У рэшце рэшт адмоўнае ўздзеянне алкаголю здольнае адступаць як толькі чалавек перастае ўжываць апошні. Значна больш шкодны ў вышэйпамянёным сэнсе нікацін, які ўплывае не на сперматазоіды, а непасрэдна на «фабрыку» па іх выпрацоўцы — клеткі сяртолі, своеасаблівы інкубатар, які паступова знішчаецца нікацінам. Калі мужчына-курэц выканаў сваю рэпрадуктыўную функцыю, то ён можа нават не здагадвацца аб сваёй няздольнасці да зачацця.

**— Такія напоі, як кава ці чай могуць адмоўна паўплываць на мужчынскія палавыя клеткі?**

— У любога захаплення ёсць адмоўны бок. У нармальных дозах ні кава, ні чай у гэтым сэнсе няшкодныя. Лепей звярнуць увагу матуль на якасць пітной вады, харчовы рацыён сыноў з самага ранняга дзяцінства. Нехватка бялку — мяса, рыбы, яек, арэхаў і г.д. выклікае дэфіцыт масы цела. А слабая мышачная маса, слабая палавая канстытуцыя — гэта будучыя праблемы з рэпрадукцыяй.

**— Хутчэй за ўсё не любіць рэпрадуктыўная сфера і стрэсаў...**

— Стрэс змяншае здольнасць да эрэкцыі. Ёсць нават такі тэрмін — неўроз чакання няўдач, да развіцця якога могуць падштурхнуць, дарэчы, і няправільныя, некарэктныя паводзіны жанчыны. Дарэчы, для самой жанчыны стрэс таксама вельмі шкодны, бо правакуе перавыспяванне яйцаклеткі, а гэта — фактар рызыкі для ўзнікнення анамалій развіцця будучага дзіцяці. У момант зачацця жанчына павінна быць спакойнай, не раздражнёнай. А для гэтага яна павінна жыць у афіцыйным шлюбе і планаваць разам з мужчынам, якому давярае, на якога можа разлічваць, нараджэнне дзяцей. На жаль, цяперашнія дзеці найчасцей «выпадковыя». Многія мае пацыенты, паводле іх слоў, пражываюць у грамадзянскіх шлюбах. Але я не думаю, што гэта станоўча ўплывае на жанчыну. Хутчэй, такія абставіны з'яўляюцца бар'ерам для рэалізацыі яе жадання стаць маці. Сям'ю абавязкова трэба планаваць. Неабходна загадзя абследавацца: ёй — у гінеколага, яму — ва ўролага. Да таго, як адважыцца на дзетараджэнне, кожны чалавек павінен як мага больш ведаць пра сваё здароўе.

**— Чым небяспечныя для мужчыны інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам?**

— У мужчын вірусы могуць асядаць на паверхні сперматазоіда і рабіць яго менш рухомым. Наогул сперматазоіды маюць адмоўны электрычны зарад, яны пастаянна адштурхоўваюцца адзін ад аднаго. А бактэрыя, якая наліпла, мае станоўчы зарад. Сперматазоіды прыцягваюцца, і нікуды, зразумела, ужо бегчы няздольны. Развіццё запаленчых працэсаў мае меншае значэнне для мужчын, чым для жанчын. Для мужчын больш важна эфектыўна пралячыць інфекцыі разам з партнёршай, паколькі недалечаная хранічная інфекцыя здольна выклікаць бясплоднасць. Таму трэба здаць аналізы не толькі адразу па завяршэнні лячэння, але і праз паўгода.

**— Дапусцім, у абследаванай, здаровай пары і год, і тры, і болей няма дзяцей. У чым можа быць прычына?**

— Можа мець месца імуналагічны канфлікт. Згодна з законам прыроды, жанчына павінна мець здаровых нашчадкаў. Цэрвікальны канал маткі працуе так, што прапускае толькі моцных сперматазоідаў, а калі шмат слабых, то арганізм пачынае выпрацоўваць антыцелы да іх — гэткіх воінаў, якія будуць «з'ядаць» слабакоў. У такім выпадку пары рэкамендуецца на нейкі час устрымацца ад адкрытага жыцця і прайсці курс тэрапіі, якая выдаліць антыцелы.

**— А раптам проста не стае актыўных сперматазоідаў? Ці можна павялічыць іх колькасць?**

— Можна правесці лячэнне мужчынскімі палавымі гармонамі. Ёсць і тэрапія ганадатропнымі гармонамі, якія выпрацоўваюцца галаўным мозгам. Прыкладна 20—30 працэнтаў «віны» ў адсутнасці нараджэння дзіцяці натуральным шляхам прыпадае на мужчын. Але некаторым з іх удаецца дапамагчы. Можна зрабіць пункцыю і біяпсію прыдатка яечка ці самога яечка. Мы робім такія аперацыі, пасля якіх мужчына становіцца «здольным» да экстракарпаральнага апладнення, бо семянная вадкасць такога пацыента будзе ўтрымліваць у лепшым выпадку некалькі тысяч сперматазоідаў. Між тым, паводле даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, для зачацця патрабуецца 40—60 мільёнаў сперматазоідаў. Навошта менавіта столькі, наўрад ці хто здольны адказаць. Аднак вядома, што 10—15 гадоў таму тая ж арганізацыя заяўляла пра іншую норму для натуральнага зачацця — 80—100 мільёнаў сперматазоідаў. Відавочна, мужчыны слабеюць...

**— Дарэчы, пра слабасць. Здаецца, менавіта ў апошнія гады з'явілася незлічоная колькасць разнастайных стымулятараў палавой актыўнасці для мужчын. Наколькі яны бяспечныя для здароўя?**

— Індустрыя сэксу — гэта адказ на попыт заходняй цывілізацыі, якая прымае разняволены сэкс, калі мужчына і жанчына жывуць кожны сваім жыццём, калі з'явілася неабходнасць у больш частай змене партнёраў. Спатрэбіліся стымулятары. І яны з'явіліся. Гадоў 20 таму пра іх нават не чуў ніхто. Яшчэ не так даўно самым вядомым моцным прэпаратам, які ўздзейнічаў, дарэчы, усяго на 5 працэнтаў спажыўцоў, быў ёхімбін. А сёння ўжыванне такіх прэпаратаў, як віягра, сіяліс, лявітра і іншых прыводзіць да эфекту ў 70 працэнтаў мужчын. З'явілася досыць многа медыцынскіх спосабаў, якія абавязкова прыводзяць да рэалізацыі жадання. Уплыў гэтых намаганняў на здароўе, магчыма, толькі вывучаецца.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Муз-news

### ЛЕПШАЕ — ДА ВАЛЯНЦІНАВА ДНЯ

Не самую вялікую, але цікавую сольную праграму збіраецца прадставіць гурт «J:Морс» на клубным канцэрце 14 лютага. У прыватнасці, у канцэрце прагучыць новая песня калектыву «Дай мне...». Зараз яна трапіла на беларускія радыёстанцыі і, мяркуючы па ўсім, паўтарае поспех ранейшых хітоў гурта «Не ўмірай» і «Басаном па маставой». Самі музыканты, дарэчы, называюць свой новы твор, у адрозненне ад восеньскіх песень, цэласным, светлым і пазітыўным.

Менавіта таму кампазіцыя і адкрые клубны канцэрт, прысвечаны Дню ўсіх закаханых. Дзіўна іншае — што гурт, які з лёгкасцю збірае самыя вялікія пляцоўкі, вырашыў у такую камерцыйна выгадную дату ўсё ж даць камернае выступленне. «Шчыра кажучы, мы проста шалёна засумавалі па той энергетыцы, па той аддачы, якую ў сядзячай зале з цяжкасцю ловіш толькі напрыканцы канцэрта, — кажа Уладзімір Пугач на гэты конт. — Калі б у Мінску былі клубныя пляцоўкі на 1,5—2 тысячы чалавек, мы толькі там і выступалі б». Так што — закаханыя ў «J:Морс», улічыце, колькасць месцаў абмежаваная...

### ПА РАБОЦЕ І ЎЗНАГАРОДА



Пераможца тэлепраекта «Зорны дыліжанс», дыпламант II Усебеларускага фестывалю народнага мастацтва «Беларусь — мая песня» Дзіма Карпінчык трапіў у лік стыпендыятаў Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Але на гэтым прыемныя сюрпрызы для маладога выканаўцы не скончыліся. Прайшоўшы кастынг, Дзіма трапіў у чарговы тэлепраект. Праўда, паводле ўмоў кантракта, спеваку забаронена распаўсюджвацца пра дэталі, але, як сцвярджае сам Дзмітрый, «калі мне пашанцуе і я прайду ў фінал, маё жыццё павернецца на 180 градусаў».

Дарэчы, удзел у тэлепраекце Дзіма Карпінчык даволі паспяхова сумяшчае з атрыманнем вышэйшай адукацыі: скончыўшы Гродзенскі каледж мастацтваў, артыст паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў на факультэт «Мастацтва эстрады».

### ПРАДЗЮСАРЫ ВЫБІРАЮЦЬ БЛАНДЗІНАК



У гурце «Топлес» зноў змена саставу — замест Насці Касянковай, якая нядаўна пакінула праект, квартэт «дапоўніла» новая салістка Ганна. Яна, як і ўсе папярэднія ўдзельніцы, у мінулым займалася мадэльным бізнэсам. Акрамя таго, Аня — бландзінка, а значыць, яшчэ большая колькасць джэнтльменаў можа накіраваць свае зацікаўленыя позіркі на абноўлены «Топлес».

Прадзюсар гурта Макс Алейнікаў абяцае ў хуткім часе «прэзентаваць» новую ўдзельніцу на публіцы, а пакуль што дзяўчына штодня займаецца вакалам і харэаграфіяй, каб не выпадаць са стройных, ва ўсіх сэнсах, шэрагаў калег па сцэне.

### КЛІП РАБІЦЕ МНЕ ХУТЧЭЙ — 18 МНЕ ЎЖО...

Спявачка LENA, якая стала сёлета самай юнай удзельніцай нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне», адзначыла сваё 18-годдзе. Падзея святкавалася ў адным са сталічных начных клубаў, куды цяпер артыстку будуць пускаць не толькі падчас выступленняў, але і як звычайную наведвальніцу — у любы час.

Галоўным падарункам для дзяўчыны, акрамя ўласна арганізацыі вялікага свята, стаў прыезд удзельнікаў брэсцкага гурта «Spasenie». З музыкантамі спявачка пазнаёмілася зусім нядаўна, але паспела пасябраваць, а таксама запісаць стопрацэнтна хітовую песню «Call



me», прысвечаную амерыканскай трагедыі 11 верасня (менавіта з гэтай кампазіцыяй LENA выступала на «ЕўраФэсце»). Дарэчы, у хуткім часе — як толькі дзяўчына скончыць змаганне з сесіяй — плануюцца здымкі відэакліпа на песню «Call me», а таксама запіс некалькіх новых песень.

### ЯК ГУЧЫЦЬ «ІДЭАЛЬНАЯ ЖОНКА»

Пра гэта многае можа расказаць беларуская спявачка Вольга Вронская. Бо менавіта яна запісала саундтрэкі да камедыі рэжысёра Уладзіміра Янкоўскага «Ідэальная жонка». Песні да гэтай «рамантычнай камедыі з элементамі фантастыкі» напісаў кампазітар Сяргей Ждановіч, ён таксама прапанаваў выканаўцу. Усяго ў фільме прагучыць дзве песні ў выкананні Вронскай — «У горадзе прахожых» і «Ключык залаты». Паводле меркавання рэжысёра, з пастаўленай задачай спявачка справілася на «выдатна».

У будучым, верагодна, песні з фільма будуць выдадзены асобна — але аб гэтым рана меркаваць, бо і сама карціна яшчэ не трапіла на экраны. Уладзімір Янкоўскі пакуль што не раскрывае ўсіх перыпетый сюжэту. Вядома толькі, што інтрыга закручваецца вакол адвечнага «калі б я быў султан і меў трох жонак». Малады, забяспечаны і прыгожы мужчына незадаволены тым, што ў ягонай жонкі не хапае сіл на сям'ю, і пачынае марыць: вось было б у мяне тры жонкі — хатняя гаспадыня, бізнэс-лэдзі і сэкс-бомба... Самае забаўнае, што гэта жаданне раптам здзяйсняецца і жонка з'яўляецца ў трох абліччах. Але ці да лепшага гэта? Даведаемся, калі фільм выйдзе ў пракат..

**Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# БАРАНАВІЦКІ СТАНКАБУДАЎНІЧЫ ЗАВОД ЗАТ «АТЛАНТ»: 20 ГАДОЎ СТАБІЛЬНАСЦІ НА РЫНКУ

## БСЗ: усё пачыналася як быццам нядаўна

**Баранавіцкі станкабудаўнічы завод ЗАТ «Атлант»** будаваўся як адно з прадпрыемстваў вытворчага аб'яднання па выпуску аўтаматычных ліній. І першай прадукцыяй станкабудаўнічай вытворчасці былі аўтаматычныя фармовачныя лініі для фарфоравай і фаянсавай прамысловасці. Праўда, з цягам часу асартымент выпускаемай прадукцыі разрастаўся, у выніку чаго БСЗ за два дзесяткі гадоў з невялікім «хвосцікам» стаў шматпрофільным прадпрыемствам, прадукцыя якога пастаянна карыстаецца павышаным попытам, што станоўча характарызуе фінансавае становішча завода.

Без сумненняў, сёння БСЗ стаіць асабняком у сваім рэгіёне сярод прамысловых аб'ектаў горада. І не толькі таму, што прадпрыемства ўжо даўно стала «градаўтваральным» у плане папаўнення дзяржаўнай, абласной і гарадской казны адпаведнымі падатковымі плацяжамі і выплатамі ў дзяржбюджэт. У большай ступені — дзякуючы ўменню калектыву прадпрыемства на чале з мудрым кіраўніцтвам працаваць у любых эканамічных умовах. Прычым, з поспехам і адпаведным размахам.

Многія кліенты Баранавіцкага станкабудаўнічага завода, які асвоіў выпуск вялікага наменклатурнага шэрагу выпускаемай прадукцыі, паціскаюць плячыма: маўляў, БСЗ знаходзіцца за баранавіцкай «кальцавой» дарогай, г.зн. у межах раёна, а «робіць неабходную фінансавую пагоду» гарадскім уладам. Гэты казус з разраду рытарычных. Проста так выйшла, што станкабудаўнічы будаваўся як гарадскі аб'ект, хоць і за «кальцавой». Зрэшты, хто раней надаваў значэнне статусу новабудоўлі?! Грошай хапала ўсім. Ды і паспрабуй угадай наконт магчымай стабільнасці завода. А раптам наадварот? Дзякуй Богу, што Баранавіцкі станкабудаўнічы завод заставаўся на плыву ўвесь час, з поспехам пераадолеў усе выпрабаванні лёсу.

Як новая старонка ў біяграфіі прадпрыемства — удзел у інтэрнацыянальным беларуска-германскім праекце па стварэнню трубапраектнай вытворчасці на базе Беларускага металургічнага завода.



**Удзел у рэалізацыі праекта дзяржаўнай важнасці — прызнанне высокага прафесіяналізму працоўнага калектыву БСЗ ЗАТ «Атлант»**

## «ДЕЛО» — ТРУБА

Умоўна так можна назваць грандыёзны праект дзяржаўнай важнасці з удзелам нямецкай кампаніі SMS-Meer, Беларускага металургічнага завода (БМЗ), што ў Жлобіне, і Баранавіцкага станкабудаўнічага завода ЗАТ «Атлант». Сутнасць гэтай праграмы — у вырабе на базе БМЗ гарачакатаных бясшоўных труб рознай даўжыні і дыяметраў, якія б адпавядалі лепшым сусветным аналагам. Працэс па ўвасабленню ўказанага праекта «пайшоў» у снежні 2005 года, калі быў падпісаны самы буйны ў гісторыі БСЗ ЗАТ «Атлант» кантракт з Беларускім металургічным заводам на выраб абсталявання для цэха гарачакатаных бясшоўных труб. Аб важнасці ролі баранавіцкіх станкабудаўнікоў, якія ўзяліся вырабіць адпаведнае абсталяванне для цэха, гаварыць вялікай патрэбы няма, бо яна надзвычайная. Стварэнне на базе БМЗ указанай вытворчасці дазволіць не столькі жлобінскаму прадпрыемству, колькі Беларусі заняць адпаведную нішу на сусветным рынку па выпуску гарачакатаных труб, якія маюць шырокае прымяненне ў многіх галінах народнай гаспадаркі, асабліва ў нафтавай і газавай прамысловасці, пры максімальнай загрузцы беларускіх прадпрыемстваў. Невыпадкова, кантроль над выкананнем задання дзяржаўнай важнасці ўзяў кіраўнік дзяржавы, які павінен адкрыць новы цэх на БМЗ 3 ліпеня 2007 года ў Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар БСЗ ЗАТ «Атлант» Уладзімір Рашатко не без гонару адзначае, што прадпрыемства, якім ён кіруе, было выбрана нямецкімі падрадчыкамі невыпадкова. Замежных партнёраў, якія да візіту ў Баранавічы аб'ехалі многія беларускія заводы, задаволіла на БСЗ усё: узровень тэхнічнага ўзбраення, інтэлектуальныя магчымасці калектыву, наяўнасць адпаведных спецыялістаў... Зараз работа па вырабу транспартнага абсталявання для новага цэха бясшоўных труб плаўна пераходзіць з адной фазы ў другую. «Гарачая» частка абсталявання, падкрэслівае дырэктар БСЗ ЗАТ «Атлант», ужо зманціравана, справа засталася за «халоднай» часткай. Усяго доля баранавіцкіх станкабудаўнікоў у «новабудоўлі» БМЗ складзе 3100 тон абсталявання з 8000 тон; астатняя частка — за нямецкім бокам.

Нехта з адказных работнікаў БСЗ ЗАТ «Атлант» падлічыў, што толькі каб перавесці ўвесь «набор» транспартнага абсталявання на месца давядзецца арганізаваць 600 машына-рэйсаў. Праўда, дастаўка і наладжванне абсталявання — гэта, можна сказаць, верхняя частка айсберга. Колькі часу было патрачана на асваенне адпаведных эскізных праектаў, выраб аснасткі і правядзенне іншых падрыхтоўчых работ... Праўда, на БСЗ лічаць, што гэтая работа многага каштуе. У першую чаргу пацвярджае імідж БСЗ як высокаінтэлектуальнага і мадэрнізаванага пастаўшчыка неабходнага абсталявання для любога партнёра.



Лабарант-металограф Таццяна Несцяровіч вызначае структуру чыгуна з дапамогай сучаснага абсталявання



Так выглядае лінія, вырабленая на БСЗ па заказу металургаў са Жлобіна.



Ліцейная вытворчасць — самая гарачая на заводзе



Майстар зборачнага цэха Вячаслаў Мядзведзеў



Электрачайнікі «Атлант» карыстаюцца попытам у пакупнікоў: за два гады на БСЗ іх выпушчана больш за 50 тыс. шт.

## Бездакорная якасць. Сучасныя тэхналогіі. Заўсёды наперадзе

**Сістэма кіравання навакольным асяроддзем адпавядае экалагічным патрабаванням СТБ ISO 14001**

### Ліцейная вытворчасць

Ліцейны цэх Баранавіцкага станкабудаўнічага завода ЗАТ «Атлант» здзяйсняе серыйны выпуск адлівак з шэрага і высокатрывалага чыгуна масай ад 0,055 кг да 40 кг.

Цэх аснашчаны адзінай у СНД установкай мадыфікавання дротам для атрымання высокатрывалага чыгуна.

На працягу ўсёй гісторыі існавання цэха вядзецца бесперапынная работа па ўдасканаленню вытворчасці, павелічэнню аб'ёмаў выпускаемай прадукцыі.

У кастрычніку 2005 года завяршылася буйнамаштабнае пераўзбраенне ліцейнага цэха, якое было зроблена менш чым за год, без спынення і змяншэння аб'ёмаў вытворчасці. Устаноўлена сучаснае, высокатэхналагічнае, экалагічна бяспечнае, энергазберагальнае абсталяванне вядучых еўрапейскіх вытворцаў.

У ліцейным цэху ўкаранёны сучасныя дасягненні навукі ў галіне металургіі. Лабараторыя цэха аснашчана найноўшым кантрольна-вымяральным абсталяваннем і праграмным забеспячэннем.

Высокаэфектыўныя пылаачышчальныя ўстаноўкі, якія адпавядаюць Еўрапейскім экалагічным нормам, дазваляюць паўторнае выкарыстанне пылу, што ўлоўліваецца, а таксама прадухіляюць павелічэнне выкідаў у атмасферу.

Ліцейная вытворчасць БСЗ ЗАТ «Атлант» з'яўляецца адной з самых лепшых чыгуналіцейных прадпрыемстваў Еўропы.

Адметна, што пастаяннае нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці, тэхнічнае пераўзбраенне здзейснены без павелічэння колькасці персаналу.

### Электрабяспечнасць кампрэсараў маркі БСЗ пацверджана сертыфікатам нямецкага выпрабавальнага цэнтра VDE



З канвеера, дзе працуе слесар механазборачных работ Наталля Кунтыш, сходзяць рухавікі-кампрэсары для халадзільнікаў «Атлант»



— Па гэтых канструкцыях «пойдуць» новыя трубы рознага дыяметра, — кажа старшы майстар Міхаіл Сукала.



Зборкай станкоў для вырабу прадукцыі з пластмасы заняты слесар Валерый Валюкевіч



На канвееры апрасоўкі статэраў будучага рухавіка працуе Алена Шалкова.

**На БСЗ ЗАТ «Атлант» дзейнічаюць чатыры асноўныя вытворчасці:**

- вытворчасць кампрэсараў;
- станкабудаўнічая вытворчасць;
- інструментальная вытворчасць;
- ліцейная вытворчасць

### Вытворчасць кампрэсараў

Першы беларускі кампрэсар для бытавога халадзільніка «Атлант» сышоў з канвеера БСЗ 13 красавіка 1993 года, 10 сакавіка 2006 года на прадпрыемстве ўжо выпушчаны 20-мільённы кампрэсар. Такая ўнушальная лічба дасягнута ўсяго за 13 гадоў.

Пры праектнай магутнасці 1,5 млн штук у год у 2005 годзе было выраблена 2,184 тыс. кампрэсараў.

Надзейнасць кампрэсара з маркай БСЗ ЗАТ «Атлант» застаецца адной з самых высокіх на існуючых рынках збыту.

***Зараз свой гарантыйны тэрмін (3 гады) спраўна адпрацоўваюць не менш за 999 кампрэсараў з 1000.***

Творчы, удумлівы, ініцыятыўны падыход да справы канструктараў і тэхнолагаў кампрэсарнай вытворчасці дазволіў палепшыць тэхнічныя характарыстыкі і якасць кампрэсара, пашырыць мадэльны рад. Так, калі ў 1993 годзе выпускалася 7 базавых мадэляў магутнасцю ад 100 да 200 Вт для работы на хладоне R12, то сёння вырабляюцца 22 мадэлі плюс усемагчымыя мадыфікацыі магутнасцю ад 60 да 200 Вт на азонанебяспечным хладоне R134a і яшчэ больш прагрэсіўным хладагенце — ізабутане (R600a).

### Транспартна-складскія і зборачныя сістэмы, тэхналагічнае абсталяванне

Адзін з асноўных накірункаў дзейнасці станкабудаўнічай вытворчасці — праектаванне і выраб імпартазамяшчальнага, канкурэнтаздольнага абсталявання для тэхнічнага пераўзбраення масавых вытворчасцяў. Паспяховы попыт супрацоўніцтва ў гэтай галіне завод мае з некаторымі расійскімі партнёрамі, напрыклад зеленадольскі ФДУП «ВА ім. Сярго», для якога БСЗ вырабіў зборачны комплекс для вытворчасці халадзільнікаў агульнай працягласцю больш за 1,5 км. Для Добрушскага фарфоравага завода было выраблена 13 адзінак абсталявання, сярод якога 4 аўтаматычныя лініі.

Плённа супрацоўнічаюць спецыялісты БСЗ і МЗХ па тэхнічнаму пераўзбраенню Мінскага завода халадзільнікаў. За апошнія 10 гадоў было спраектавана і выраблена больш за 75 найменняў унікальнага спецыяльнага тэхналагічнага абсталявання для забеспячэння тэхнічнага працэсу выпуску халадзільнікаў, мадэрнізаваны канвееры і складскія сістэмы

### Вытворчасць пральных машын «Атлант»



Прадукцыя БСЗ ЗАТ «Атлант»: тэрмапласт-аўтаматы, лінія парэзкі і транспартныя сістэмы для перамяшчэння абсталявання ўдала ўпісалася ў новую вытворчасць на сталічным заводзе бытавой тэхнікі па выпуску пральных машын «Атлант».

На мінулым тыдні гэтае прадпрыемства наведаў кіраўнік дзяржавы, які даў высокую ацэнку новай вытворчасці. На гэтай сустрэчы было адзначана, што выпуск пральных машын арганізаваны на высокім узроўні і адпавядае ўсім еўрапейскім нормам. Складанейшыя тэхналагічныя працэсы выконваюцца з высокай дакладнасцю на сучасных аўтаматызаваных лініях.

### Перапрацоўка пластмас

Баранавіцкія станкабудаўнікі з'яўляюцца **адзінымі ў Беларусі**, хто асвоіў праектаванне і выраб тэхналагічна закончаных сістэм па вытворчасці прадукцыі з пластмас.

Сёння завод выпускае 4 тыпапамеры тэрмапласт-аўтаматаў з намаганнем запірання ад 125 да 450 тон, а таксама шырокую гаму дапаможнага абсталявання і аснасткі. Ліцейныя машыны і аўтаматызаваныя комплексы, вырабленыя на БСЗ, дзейнічаюць на поўную магутнасць у рэальных умовах вытворчасці на прадпрыемствах Беларусі і Расіі. Кампактнае, высокапрадукцыйнае абсталяванне, аснашчанае самай сучаснай электронікай, дае магчымасць выпускаць вырабы высокай якасці і любога дызайну.

**Сістэма ўпраўлення якасцю станкабудаўнічай вытворчасці завода сертыфікавана на адпаведнасць патрабаванням міжнароднага стандарту ISO 9001.**

### Сацыяльна-спартыўная сфера

На БСЗ ЗАТ «Атлант» не па чутках ведаюць, што калі добра ўмееш працаваць, то ўмей так і адпачываць.

● **Санаторый «Чабарок»** вырас на базе піянерскага лагера-базы адпачынку. Цяпер — гэта гармонія прыродных фактараў і сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базы. Унікальнае лячэбна-дыягнастычнае абсталяванне і вопытны медперсанал гарантуюць пацыентам санаторыя ўмацаванне здароўя круглы год. Утульныя нумары, сталовая з адмысловай беларускай кухняй, фізкультурны комплекс, бібліятэка, цудоўныя лясныя азёры — у санаторыі «Чабарок» ёсць усё для паўнацэннага адпачынку дарослых і дзяцей.

● У 2001 годзе ўведзены ў эксплуатацыю **спарткомплекс «Атлант»**, які адпавядае лепшым еўрапейскім стандартам. На яго базе праводзяцца рэспубліканскія і міжнародныя спаборніцтвы па валейболу, міні-футболу, гімнастыцы. СК «Атлант» з'яўляецца базай чэмпіёна Беларусі па валейболу — жаночай каманды «Атлант-БарДУ». Тут ёсць трэнажорная зала, сауна, басейн, салярый.







Гэтыя фотаздымкі знаёмяць з санаторыем-прафілакторыем «Чабарок», дзіцячым садком, спартыўным комплексам, дзе адпачываюць станкабудаўнікі і падрастаюць самыя маленькія з іх сем'яў.

**БСЗ ЗАТ «Атлант» — неаднаразовы ўладальнік прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці.**

Матэрыялы старонкі падрыхтавалі Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

Запрашаем да супрацоўніцтва: 225400 Брэсцкая вобласць, г. Баранавічы, вул. Наканечнікава, 50. Тэл.: +375 163 47-97-10, 46-35-86; тэл./факс +375 163 46-57-18, 46-35-61. e-mail: atlant@brest.by; http://www.atlant.by

# ПЯТНІЦА, 2 ЛЮТАГА

#### 1

**6.00, 17.00 Серыял «Усё змяшалася ў доме...».**
**6.45, 0.50** Дзень спорту.
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 9.05** Прэс-агляд.
**7.10, 7.35, 8.10, 8.35** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**7.30, 8.30** «Дзелавое жыццё».
**9.10, 20.00 Серыял «Прымадонна».**
**10.00** «Шпілька».
**10.35 Серыял «Каханне як каханне».**
**11.30** «Пачатак». Відэафільм АТН.
**12.10** «Сфера інтарэсаў».
**12.35 Дэтэктыў «Сышчык Пецярбургскай паліцыі».**
**14.05** «Нятленныя ноты». «Фрэдэрык Шапэн».
**14.30** «Брытва Акама».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Мультфільм.
**15.55, 1.00 Серыял «Джыўс і Вустэр».**
**17.55** «Усе стыхіі».
**18.25** «У свеце матораў».
**19.35** «Зона Х. Вынікі тыдня».
**21.00** «Панарама».
**21.45 Трылер «Грошы на дваіх».**



*Зорка студэнцкай каманды па амерыканскаму футболу валодае рэдкім дарам прадказваць зыход матчаў. Пасля атрыманай траўмы яму прыходзіцца шукаць новыя спосабы заробку.*

**23.55** «Культурныя людзі».

#### Н

**7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.35** Нашы навіны.
**7.05** «Наша раніца».
**9.05 Серыял «Талісман».**
**9.55 Серыял «Сёстры па крыві».**
**11.05** «Жарт за жартам».
**12.00** «Малахаў+».
**13.05 Серыял «Сабачая справа».**
**14.00** «Дэтэктывы».
**14.30** «Кантрольная закупка».
**15.00** «Лаліта. Без комплексаў».
**16.10 Серыял «Тайны Смалвіля».**
**17.05** «Няхай гавораць».
**18.15, 21.00, 23.50** Навіны спорту.
**18.20** Па-за законам. «Арандаваная куля».
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Розыгрыш».
**22.15** «Сярэбраны грамафон».
**23.55 Маст. фільм «Мой асабісты штат Айдаха».**
*Пра лёс бяздомнага хлопчыка, які падпрацоўвае прастытуцыяй.*



#### ЛАД

**7.00** «Ранішняя падзарадка».
**8.05, 17.30 Серыял «Салодкі плод».**
**9.00, 16.00** Навіны культуры.
**9.10** «У гэты дзень».
**9.15 Серыял «Закаханы агент».**
**10.10, 18.30 Серыял «Золата Югры».**
**11.05** «Як гэта робіцца».
**11.35** «Ядзім дома».
**12.05** Мультфільмы.
**12.35** «Спорт, спорт, спорт...».
**13.05** Дак. серыял «Вялікія спакусніцы кіно». Ані Дзюперэй.
**13.40 Драма «Хам».**
**14.50** Спектакль «Падарожжа з Драўляным рыцарам».
**16.10** Дак. фільм «Трыццаць гадоў чакання».
**16.50 Серыял «Прыгоды Скіпі».**
**17.10** «Анекдот. LAD».
**20.30** «Калыханка».
**20.45** «Беларуская часінка».
**21.40** «Правы чалавека».
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі.
**22.50** Хакей. НХЛ.
**23.50** Баскетбол. НБА.

#### ТВ РЕН

**6.05, 17.20** «Міншчына».
**6.15, 7.40** «З чаго пачынаецца раніца».
**7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**8.40** «Аўтапанарама».
**9.00 Серыял «Салдаты 7».**
**10.00** «Сталкер».
**10.40** «Тэма дня».
**10.45** «Дарагая перадача».
**11.00** «Гадзіна суда: справы сямейныя».
**12.00** «Гадзіна суда».
**13.00** «Асабісты інтарэс».
**13.50, 18.25 Серыял «Пяць мінут да метро».**
**14.50** «Геркулес». Мультсерыял.
**15.15** «Неверагодныя гісторыі».
**16.00** «Ёсць кантакт».
**16.50 Серыял «Трое зверху».**
**17.30** «Званая вячэра 2».
**20.05** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, малыш».
**20.30 Камедыя «Пстрыкні пальцам толькі раз».**
**22.55** «Відзьма-нявідзьма».
**23.30 Трылер «Тайная здзелка».**
**1.15** «Па поўнай праграме».
**1.55 Серыял «4400».**

#### Мир

**6.00** Зараджайся!
**7.30, 18.15 Серыял «Час кахаць».**
**8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30** «Навіны Садружнасці».
**8.45, 12.00, 22.30** Студыя 60—90.
**9.00** Даведнік.
**9.30** Ток-шоу «Спрэчная тэрыторыя».
**10.30** Дак. серыял «Доказы старажытнасці».
**12.15, 22.45 Маст. фільм «Аварыя». 2-я серыя.**
**13.45** Урокі англійскай мовы.
14.00 Дзіцячы сеанс «Экхарт».
**15.00** Дак. серыял «Сливки общества».
**16.00 Серыял «Чалавек мора».**
**17.00** Дак. серыял «Вясельныя вар'яцтвы».
**18.00** Акцэнты.
**19.15** Канцэрт.
**19.45** «Цік-так».
**20.00** Лепшае з джэнтэльмен-шоу.
**21.00 Серыял «Бушыдо — шлях воіна».**
**22.00** Акцэнты +.

#### ВосьМой

**7.00** «Сад і агарод — плюс».
**7.15, 9.55, 21.05, 23.30** «Метэапрагноз».
**7.20 Маст. фільм «Айцец Сергій».**
**8.55** «К-гульня».
**9.00** «Дом жывых гісторый».
**9.30** «Топ-8».
**9.50, 21.00** Інфармбюро «Міжнароднае».
**10.00 Маст. фільм «Мемуары гейшы».**
**12.30** «Тэлечат — «8 канал».
**16.30** «Мультпарад».
**16.40** «К-відэа для дзяцей».
**17.00 Маст. фільм «Падранкі».**
**18.40** «Дзіно».
**19.00** Гісторыя ў асобах. Архіў 8-га тэлеканала.
**19.40** «Сад і агарод».
**19.45 Серыял «Прыгоды сакрэтнага агента».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.10** «Каралі муай тай».
**21.25 Трылер «Бяссонніца».**

#### РОССИЯ

**7.00** «Добрай раніцы, Расія!».
**9.10** «Мой сярэбраны шар. Георгій Буркоў».
**10.00 Серыял «Тайны следства-3».**
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30, 14.20, 17.20, 19.45** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.50 Серыял «Ад'ютанты кахання».**
**13.45, 16.40, 18.40** Весткі. Дзяжурная часць.
**14.40** Пакой смеху.
**15.30** «Суд ідзе».
**17.40 Серыял «Асуджаная стаць зоркай».**
**20.05** «Добрай ночы, малышы!».
**20.15** «Юрмала».
**22.05** Канцэрт Аляксандра Сярова.
**0.15 Камедыя «Із ноў гуд, або Каліф на гадзіну».**

#### НТВ Беларусь

**8.00, 8.30, 9.00, 9.30, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.10, 8.35, 9.10, 9.35** Сёння раніцай.
**10.25** «30-я глава».
**10.50** «Крымінальная Расія».
**11.20 Серыял «Фабрыка мрояў».**
**12.10** «Дзве праўды».
**13.30 Серыял «Сталін. Live».**
**14.15 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў-6».**
**15.05** «Авіятары».
**15.30** «Агляд. Выратавальнікі».
**16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**18.05** «Крымінальная Расія».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.45** «Следства вялі...». «Падробленыя 25-рублёвыя купюры ў сярэдзіне 70-х гадоў».
**20.45 Драма «Алі».**



*На яго рахунку ўсяго тры прайграныя баі за 20 гадоў. Яго жыццёвы дэвіз: «У жыцці заўсёды трэба змагацца. Не прайграваць. Не здавацца. І перамагаць».*

**23.30 Камедыя «Жыццё кулём».**

#### ТВ ЦЕНТР

**5.00** «Настрой».
**7.30, 20.15 Серыял «Расплата за грахі».**
**8.25 Маст. фільм «Маці і мачаха».**
**10.05** «Дэтэктыўныя гісторыі». «Пад маскай тыгра».
**10.30, 13.30, 16.30, 23.25** Пятроўка, 38.
**10.45, 13.45, 16.45, 19.45** Падзеі.
**11.00** «У цэнтры ўвагі».
**11.35, 2.15 Серыял «Адна справа на дваіх».**
**12.50** Дзелавая Масква.
**14.00** Небяспечная зона.
**14.30 Серыял «Участак».**
**15.30** Новая «Часінка».
**17.15** «У цэнтры ўвагі». «Каляровая палітыка».
**17.45 Серыял «Страсці па-італьянску-2».**
**18.50** «Паляўнічыя за нацыстамі». Фільм 4-ы.
**21.10** Момант ісціны.
**22.00** «Народ хоча ведаць». Ток-шоу.
**22.55** Падзеі. 25-я гадзіна.
**23.40 Маст. фільм «Гамлет».**
**3.25 Серыял «Кардзье — вартавыя парадку».**
**4.55** Мультфільм.

#### EUROSPORT

**9.30** Санны спорт. Кубак свету ў Германіі.
**10.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Швейцарыі.
**11.00, 16.00** Біятлон. Кубак свету ў Славеніі.
**13.00, 20.30** Самыя дужыя людзі планеты.
**14.00, 17.00, 21.00** Снукер. Кубак Мальты.
**20.00, 0.00** Футбол. 24 лепшыя клубы Еўропы.
**0.30, 1.30** Экстрэмальны спорт.
**1.00** Сноўборд.

## ФІЛЬМ ДНЯ

### «СТБ» 20.30 «ПСТРЫКНІ ПАЛЬЦАМ ТОЛЬКІ РАЗ» (ФРАНЦЫЯ, 2005 Г.)

Муж і жонка Берэсфорд наведваюць сваячку, якая жыве ў доме для састарэлых. Візіт паварочваецца для паважнай пары нечаканымі і небяспечнымі прыгодамі.

**Рэжысёр** — Паскаль Тома. **У ролях:** Катрын Фро, Андрэ Дзюсалье, Жэнев'ева Бюжо, Ларан Тэрзіеф, Валеры Капрыскі, Бернар Верлей.



*Віншуем **Іаліну Андрэеўну МІХАЙЛАВУ** з 70-годдзем. Жадаем моцнага здароўя, бадзёрага настрою, доўгіх гадоў шчаслівага жыцця.*

**Родныя,** г. Мінск.

# СУБОТА, 3 ЛЮТАГА

#### 1

**6.35** Дзень спорту.
**6.45** Мультфільм.
**7.00 Серыял «Адзін год на вінаградніках».**
**7.30** «Існасць».
**7.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.10** «Ранішняя хваля».
**9.40** «Кухня гумару».
**10.15** «Альманах падарожжаў».
**10.45** «Вось такія пірагі».
**11.25** «У свеце матораў».
**12.10 Камедыя «Сем нянек».**
**13.35** «Раўнавага: асяроддзе пражывання».
**14.05** «Арбіты жыцця».
**14.30** «Мужчынскі характар».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Зона Х. Вынікі тыдня».
**15.50** «Зямельнае пытанне».
**16.10** «Уэльс з вышыні птушынага палёту». Дак. серыял.
**17.10** «ЕўраФэст. Дзень за днём».
**17.25** «Вакол планеты».
**18.00** «Ваша лато».
**19.10 Камедыя «Грабеж па-французску».**
*Ён марыць аб ідэальным грабяжы. Асабняк ювеліра ў далёкім Чыкага здаецца яму прывабнай здабычай.*
**21.00** «Панарама».
**21.40 Драма «Бумер».**
**23.40** «Музычны плэй-оф». Супер-фінал у Лондане.

#### Н

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05 Серыял «Сябры».**
**9.40** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.00** «Звярынец».
**11.30** «Хачу ўсё ведаць».
**12.05** «Сакрэты фільмаў пра дзікую прыроду». Дак. серыял.
**12.35** «Тэлечасопіс «Саюз».
**13.20 Камедыя «Водпуск за свой кошт».**
**16.10** «50 — гэта смешна». Творчы вечар Яўгена Крыжаноўскага.
**18.30** Лядовае шоу Яўгена Плюшчанкі.
**20.00** Вялікая палітыка.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Зорны цырк».
**23.05 Маст. фільм «Патрэбныя людзі».**

#### ЛАД

**8.00** «Дзіцячая гадзіна».
**9.05** Мультфільм.
**9.15 Серыял «Дынатопія».**
**10.00** «Дабравест».
**10.25** «Жансавет».
**11.00** «Сезон у дачи».
**11.25** Мультфільм.
**11.40** Біятлон. Чэмпіянат свету. Спрынт 10 км. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**13.00** «Добрыя навіны».
**13.25** І. Стравінскі. Балет «Вясна свяшчэнная».
**14.20** «Тэатр. Выбранае».
**14.45** Дак. фільм «Мастак Леанід Шчамялёў».
**15.10** Біятлон. Чэмпіянат свету.
**16.30** «Плошча мастацтваў».
**17.00** «Святло далёкай зоркі. Міхаіл Раманюк».
**17.25** «Лёс чалавека». Аляксандр Дзітлоў.
**17.50 Меладрама «Рабро Адама».**
**19.15** «Анекдот. LAD».
**19.35 Камедыя «Каралі жартаў».**
**21.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі.
**23.10** Баскетбол. НБА.

#### ТВ РЕН

**6.10** «Дзікая планета»: «Зямля дзікай свабоды». Дак. фільм.
**7.00** «Ваенная тайна».
**7.45** «З дакладных крыніц».
**8.00** «А раптам атрымаецца!». Мультфільм.
**8.05** Дзіцячы сеанс. «Няззнайка з нашага двара».
**9.10** «Голы кухар».
**9.45** «Наш дом».
**10.10** «Мінск і мінчане».
**10.40** «Крымінальнае чытво».
**11.30** «Лёсам напісаныя радкі».
**12.00 Серыял «Татачкаў сынок».**
**13.00** «Перапынак». Мультсерыял.
**13.45 Меладрама «Каханне з прывілеямі». 1-я серыя.**
**15.15** «Народжаныя ў СССР».
**16.00** «Надзвычайныя гісторыі»: «Новыя амазонкі, або Змена полу без аперацыі».
**16.55** «Відзьма-нявідзьма».
**17.30** «Гучная справа»: «Справа Літвіненка: ахвяра палонію». Дак. фільм.
**18.30** «Прыватныя гісторыі».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Драма «Правілы бою».**
**22.40** «Схема смеху».
**23.30 Серыял «Мяне завуць Эрл».**
**23.55 Маст. фільм «Падручнік кахання».**



*Гісторыя ў чатырох эпізодах пра чатыры фазы кахання — закаханасць, крызіс, здрада, расставанне.*

**1.15** «In reality».
**2.20 Камедыя «Пстрыкні пальцам толькі раз».**

#### Мир

**6.00, 15.00** Дак. серыял «Хіт-парад дзікай прыроды».
**7.30** Мультсерыял «Мобі Дзік».
**8.00 Серыял «Закон джунгляў».**
**9.00** Мар, дзейнічай, будзь!
**9.30** «Хіт-экспрэс».
**10.30** Лепшыя праграмы Садружнасці.
**11.00** Даведнік.
**11.30, 14.30, 17.30, 20.30** «Навіны Садружнасці».
**12.00 Казкі нашага дзяцінства «Новыя прыгоды капітана Врунгеля».**
**14.00** Казахстан: старонкі гісторыі.
**16.00** Аднакашнікі.
**17.00** Камедыйны кактэйль.
**18.15** Краіна мая.
**18.45** Дак. серыял «Чарадзейная планета».
**19.45** «Цік-так».
**20.00** Спецыяльны рэпартаж.
**21.00 Маст. фільм «Ультымо-1». 1-я серыя.**
**23.00 Серыял «Х-мутант».**

#### ВосьМой

**9.00** «Сад і агарод».
**9.05, 21.00, 23.30** «Метэапрагноз».
**9.10** «Адзінка ў кубе».
**9.30** «Дзіно».
**9.55** «К-гульня».
**10.00** «Каралі муай тай».
**10.15 Маст. фільм «Бяссонніца».**
**12.15 Серыял «Двайны агент».**
**13.50 Камедыя «Блеф».**
**15.30** «Мультпарад».
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Серыял «Міс Марпл вядзе расследаванне».**
**18.45** «Сад і агарод — плюс».
**19.00 Камедыя «Жандар жэніцца».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Маст. фільм «Джэймс Бонд — агент 007».**
**23.25** «Навіны кіно».

#### РОССИЯ

**7.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**7.10** Добрай раніцы, Расія!
**9.05** «Ваенная праграма».
**9.30** «Ранішняя пошта».
**10.00** «Сто да аднаго».
**11.15** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.25** Аншлаг і кампанія.
**12.20** Суботнік.
**13.00** Вакол свету.
**14.20 Меладрама «Школьны вальс».**
**16.05** «Нацыянальны інтарэс».
**17.20** Мясцовы час. Тыдзень у горадзе.
**18.00** Музычны конкурс «Сакрэт поспеху».
**19.00** Весткі. Дзяжурная часць.
**19.30** «Сумленны дэтэктыў».
**20.20** «Суботні вечар».
**22.10 Маст. фільм «Спіс Шындлера».**
*Рэальная гісторыя загадкавага Оскара Шындлера, члена нацысцкай партыі, паспяховага фабрыканта, які выратаваў падчас Другой сусветнай вайны больш за тысячу яўрэяў.*
**1.10 Меладрама «Кахае— не кахае».**

#### НТВ Беларусь

**9.00** «Без рэцэпта».
**9.30** «Агляд».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25** «Асабліва небяспечны!».
**13.55 Маст. фільм «Сельскі ўрач».**
**16.30** «Жаночы погляд».
**17.10 Дэтэктыў «Карчма на Пятніцкай».**
**19.45** «Прафесія — рэпарцёр».
**20.15** «Праграма Максімум».
**21.20** «Рускія сенсацыі».
**22.10** «Рэальная палітыка».
**23.00 Трылер «Сувязь».**
**0.50** «Мікс-файт М-1. Баі без правілаў».

#### ТВ ЦЕНТР

**5.20 Маст. фільм «Маці і мачаха».**
**7.00** Марш-кідок.
**7.30** Праваслаўная энцыклапедыя.
**8.00** Ключавы момант.
**8.45** «Вітамін росту». Мультфільм.
**8.50** АБВГДэйка.
**9.20 Фільм-казка «Варвара-краса, доўгая каса».**
**10.45, 13.45, 16.45, 23.10** Падзеі.
**11.10** «Учынак». Ток-шоу.
**12.00** «Сто пытанняў даросламу».
**12.55** Гарадскі сход.
**14.00** Дак. фільм «Падары фюрэру дзіця. Каханне ў Трэцім рэйху».
**14.50 Дэтэктыў «Сумка інкасатара».**
**17.00** «Ігар Саруханаў. Лепшыя песні».
**18.00 Дэтэктыў «Пуаро Агаты Крысці».**
**20.00** «Пастскрыптум».
**21.00 Баявік «Раптоўная смерць».**
**23.30 Баявік «Памятай».**
**1.40 Меладрама «Апошні танец».**
**3.30 Серыял «Адна справа на дваіх».**

#### EUROSPORT

**9.30** Футбол. 24 лепшыя клубы Еўропы.
**10.00** Тэніс. Турнір WTA ў Японіі.
**11.00** Біятлон. Кубак свету ў Славеніі.
**11.30, 15.00, 2.00** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Італіі.
**13.15** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Швейцарыі.
**16.45** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету ў Польшчы.
**18.00, 21.30** Снукер. Кубак Мальты.
**19.00** Лёгкая атлетыка ў памяшканні (Германія).
**0.00** Байцоўскі клуб. Лепшае-2006.

## ФІЛЬМ ДНЯ

### «ПЕРШЫ» 21.40 «БУМЕР» (РАСІЯ, 2003 Г.)

*Узнагароды: спецыяльны прыз журы за лепшы дэбют, прыз «Сярэбраны пегас», прэмія «Блокбастэр», прэмія расійскіх кінакрытыкаў «Залаты Авен», прэмія «Ніка», галоўны прыз «Залатая тайга», прэмія «Залаты пярсцёнак».*

У жыцці без правілаў ім няма дарогі назад, і чорны «бумер» — магутны і надзейны — нясе іх усё далей ад Масквы, у шалёную і бязлітасную глуш расійскіх дарог.

**Рэжысёр** — Пётр Буслаў. **У ролях:** Уладзімір Удавічэнкаў, Андрэй Мярзлікін, Максім Канавалаў.



# НЯДЗЕЛЯ, 4 ЛЮТАГА

#### 1

**6.40** Мультфільм.
**7.05** Дак. серыял «Адзін год на вінаградніках».
**7.30** «Брытва Акама».
**8.00** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.05** «Арсенал».
**9.35** «Усе стыхіі».
**10.05** «Тайны смак».
**10.35** «Шпілька».
**11.10** «КомпаС».
**11.45** «ЕўраФэст». Дзень за днём.
**12.10 Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава».**
**13.45** «Здароўе».
**14.20** «Сузор'е надзей».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30 Камедыя «Ехалі два шафёры».**
**17.00** Дак. фільм «Сцэнарная імітацыя» пра народнага артыста Беларусі М. Кірычэнку.
**17.25** «Час кіно».
**18.00** «Суперлато».
**19.00 Баявік «Хронікі Хуаду: Лязо Розы».**
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.25 Драма «Бумер. Фільм другі».**

#### Н

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00. 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропаведзь.
**9.15 Серыял «Сябры».**
**9.50** «Бесталковыя нататкі».
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** «Ранішняя пошта».
**12.00** «Разумніцы і разумнікі».
**12.40** «Гэтыя цудоўныя жывёлы». Дак. серыял.
**13.35 Маст. фільм «Белае сонца пустыні».**
**15.15** «Народжаныя зоркамі». Дак. фільм.
**16.15** «Міжнародная панарама».
**16.35** «Новыя песні аб галоўным».
**18.00 Маст. фільм «Летуценнік».**



*Бацька — паважаны трэнер коннага спорту. У яго дачкі Кейл ёсць запаветнае жаданне — вылечыць любімага скакавога каня.*

**20.00** Контуры.
**21.05** «Подых планеты».
**21.35 Трылер «Каханне і страхі Марыі».**
**23.35** «Вялікая спрэчка».
**1.00** «Камедзі Клаб».

#### ЛАД

**8.00** «Дзіцячая гадзіна».
**9.05** Мультсерыял «Атэль прывідаў».
**9.35 Серыял «Дзінатопія».**
**10.20** «Мір вашаму дому».
**10.30** «Смачная раніца».
**10.55** «Сама сабе гаспадыня».
**11.25** «Як гэта робіцца».
**11.55** «ПРАсоўванне+».
**12.10, 15.10** Біятлон. Кубак свету.
**13.00** «Спявай, душа!».
**13.30** «Гаспадар».
**13.55** «Слова пісьменніка».
**14.20** «ПРАсоўванне+».
**14.40** «Спорт, спорт, спорт...».
**16.00** «Вас выклікае Спартландыя».
**16.45 Маст. фільм «Шэльма».**
**17.55** «Анекдот. LAD».
**18.10 Меладрама «Лэдзі Бос».**
**21.10** «Тэлебарометр».
**21.25, 23.00** Гандбол. Чэмпіянат свету.
**22.45** «ПРАсоўванне+».

#### ТВ РЕН

**6.10** «Дзікая планета»: «Крылатыя марафонцы». Дак. фільм.
**7.00** «Суперняня».
**7.45** Мультфільмы.
**8.10 Дзіцячы сеанс. «Няззнайка з нашага двара». 2-я серыя.**
**9.15** «Аўтапанарама».
**9.40** «Відавочца».
**10.30** «Вялікае снеданне».
**11.05** «Культурнае жыццё».
**11.35** «Добры дзень, доктар!».
**12.05 «Татачкаў сынок». Серыял.**
**13.05** «Перапынак». Мультсерыял.
**13.50 Меладрама «Каханне з прывілеямі». 2-я серыя.**
**15.10** «Дарагая перадача».
**15.30** «Ессе homo».
**16.00** «Новыя падарожжы дылетанта».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Неверагодныя гісторыі».
**17.40** «Нацыянальны здабытак».
**18.10** «Вялікія мазгаломы».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.45 Меладрама «Калі толькі».**
*Аднойчы Пітэру прысніўся страшны сон, у якім ён губляе сваю каханую ў аўтакатастрофе. Нечакана сон збываецца.*



**22.40** «Спартыўны тыдзень».
**23.10** «Прафесійны бокс».
**0.10** «Па поўнай праграме».
**0.50 «4400». Серыял.**
**1.35 Драма «Правілы бою».**

#### Мир

**6.00, 15.00** Дак. серыял «Згубленыя светы».
**7.30** Мультсерыял «Мобі Дзік».
**8.00 Серыял «Закон джунгляў».**
**9.00** «Мільён пытанняў аб прыродзе».
**9.15** Дзеці сонца.
**9.30** «Парад парадаў».
**10.30** «Хвост каметы».
**11.30, 14.30, 17.30** «Навіны Садружнасці».
**12.00** Любімыя акцёры: Васіль Шукшын.
**12.15 Камедыя «Печкі-лавачкі».**
**14.00** Сямейны альбом.
**16.00** Паэзія Арменіі.
**16.15** Любоўныя гісторыі.
**16.45** Арт-рэвалюцыя.
**17.00** Камедыйны кактэйль.
**18.15** Каму на Русі жыць добра.
**18.45** У нашу гавань заходзілі караблі.
**19.45** «Цік-так».
**20.00** «Разам».
**21.00 Маст. фільм «Ультыма-1». 2-я серыя.**
**23.00 Серыял «Х-мутант».**

#### ВосьМой

**9.00, 18.55** «Сад і агарод».
**9.05, 21.00** «Метэапрагноз».
**9.10** «Адзінка ў кубе».
**9.30** «Дзіно».
**9.55** «К-гульня».
**10.00 Маст. фільм «Джэймс Бонд — агент 007».**
**12.00 Серыял «Двайны агент».**
**13.50 Маст. фільм «Калі дрэвы былі вялікія».**
**15.20** «К-відэа для дзяцей».
**15.40 Фільм для дзяцей.**
**16.55, 23.30** «Навіны кіно».
**17.00 Чарлі Чаплін. Маст. фільм «Вялікі дыктатар».**
**18.45** «К-відэа Топ-8».
**19.00 Камедыя «Маўчы!».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Баявік «Містэр і місіс Сміт».**

#### РОССИЯ

**7.00, 11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**7.15 Кіно для дзяцей. «Чорная курыца, або Падземныя жыхары».**
**8.30** Мультфільмы.
**9.00** «Дыялогі пра жывёл».
**9.30** «Здароўе».
**10.00** «Сам сабе рэжысёр».
**11.10** Мясцовы час. Весткі—Масква.
**11.20** «Гарадок». Дайджэст.
**11.50** «Смехапанарама».
**12.10** «Апошняя гастроль Джо Дасена».
**13.05** Фіціль.
**14.20 Камедыя «Нябесныя ластаўкі».**
**16.40** Мультфільмы.
**17.10** «Смяяцца дазваляецца».
**19.00** «Весткі тыдня».
**20.00** «Спецыяльны карэспандэнт».
**20.30 Маст. фільм «База «Клейтан».**
**22.20** Камедыя «XXL».
**0.10 Маст. фільм «Энергія зла».**

#### НТВ Беларусь

**9.30** «Дзікі свет».
**10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**10.20** «Усё адразу!».
**10.55** «Шчаслівы рэйс».
**11.45** «Іх норавы».
**12.25** «Авіятары».
**13.25** «30-я глава».
**14.05 Камедыя «Не строй дурня...».**
**16.30** «Адзін дзень. Новая версія».
**17.10 Серыял «Адвакат».**
**19.00** Сёння. Падагульняючая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.20** «Галоўны герой».
**22.25** «Нядзельны вечар».
**23.35 Трылер «Лічба».**



*Стаміўшыся ад занудлівага жыцця і некаханай жонкі, ён ахвотна пагаджаецца займацца шпіянажам для магутнай карпарацыі.*

#### ТВ ЦЕНТР

**4.40 Маст. фільм «Сумка інкасатара».**
**6.30** Права на надзею.
**6.55** Дзённік падарожніка.
**7.25** Сялянская застава.
**8.00** Ключавы момант.
**8.45, 3.05** «Рэпарцёр».
**9.00** На дачы.
**9.35** «Аляксандр Шылаў. Дарогай вялікіх майстроў».
**10.45, 22.50** Падзеі.
**10.55 Камедыя «Зыходзячы — сыходзь».**
**12.45** Марыя Званарова ў праграме «Запрашае Барыс Ноткін».
**13.10** «21 кабінет».
**13.45** Падзеі. Маскоўскі тыдзень.
**14.25** «Жывая прырода». «Глыбакаводны свет».
**15.15** «Ад смешнага да вялікага...».
**16.00** «Недапісаны сшытак». Канцэрт памяці Ігара Талькова.
**17.35** «Дэтэктыўная гісторыя». «Атрута па сходнай цане».
**18.05 Камедыя «Уся праўда ў каханні».**
**20.00** «У цэнтры падзей».
**21.05 Маст. фільм «Каўказская рулетка».**
**23.05 Дэтэктыў «Няўлоўны».**
**0.55** Мотадром.
**1.25 Маст. фільм «Ноч светлая».**
*Працаваць у інтэрнаце для слепаглуханямых дзяцей — значыць прысвяціць ім сваё жыццё.*
**3.20 «Кардзье — вартавыя парадку». Серыял.**

#### EUROSPORT

**9.30** Тэніс. Турнір WTA ў Японіі.
**10.30** Санны спорт. Чэмпіянат свету ў Аўстрыі.
**11.00, 13.00** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету ў Польшчы.
**12.00, 14.45, 0.30** Біятлон. Чэмпіянат свету ў Італіі.
**13.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Швейцарыі.
**16.00, 20.30** Снукер. Кубак Мальты. Фінал.
**18.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Швейцарыі.
**19.15, 1.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі.
**20.00, 2.00** Агляд снежнага ўік-энда.
**23.00** Бокс.

**У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!**

## ФІЛЬМ ДНЯ

### «ПЕРШЫ» 22.25 «БУМЕР. ФІЛЬМ ДРУГІ» (РАСІЯ, 2006 Г.)

За яго свабоду заплачана крывёю іншага чалавека. І вось ужо Кот у новым «бумеры» едзе да сястры загінулага з-за яго хлопца, каб перадаць яго перадсмяротнае пісьмо і паспрабаваць вымаліць дараванне.

**Рэжысёр** — Пётр Буслаў. **У ролях:** Святлана Усцінава, Уладзімір Удавічэнкаў, Андрэй Мярзлікін.



## Усміхнёмся!

Адзін баксёр расказвае другому:

— У мяне ўчора ў метро адзін цыган папрасіў грошай на аперацыю.

— І ты даў?

— Даў.

— Шмат?

— Ды не, але аперацыю рабіць давядзецца...

☺

— Што такое бяспечны сэкс?

— Гэта калі муж не ведае.

☺

Запіс у школьным дзённіку.

«Паважаныя бацькі! Пастрыжыце, калі ласка, свайго сына. Хочацца паглядзець яму ў вочы.»

## ПАСЛЯ ЗМЕНЫ ТЭЛЕФОНАЎ ЭКСТРАННЫХ СЛУЖБАЎ АДМЕНЯЦЬ І «ВАСЬМЁРКУ»

У ноч на 31 сакавіка зменяцца ўсе двух- і трохзначныя нумары, якія пачынаюцца з нуля: замест «0» будзе набірацца «1». Для прыкладу, замест нумара даведачнай службы кодаў гарадоў «053» будзем набіраць «153», службу дакладнага часу выклікаць па нумару «188», «Прагноз надвор'я» як «195» і гэтак далей. Платная даведачная аб нумарах тэлефонаў кватэрных абанентаў і арганізацый «009» будзе працаваць па нумару «109», бясплатная даведка аб нумарах медыцынскіх устаноў, экстранных і аварыйных службаў па нумару «199».

У выпадку няправільнага набора экстраных службаў па нумарах «101, «102», «103» і «104» спрацуе аўтаадказчык, які паведаміць абанентам правільныя нумары. Пра новыя нумары ўсіх астатніх даведачных службаў можна будзе даведацца па тэлефоне бясплатнай даведачнай службы «199». Даведка будзе працаваць на працягу трох месяцаў — да 30 чэрвеня. А вось пераход на новыя нумары адбудзецца адразу, з 31 сакавіка, і паралельнага набору старых і новых тэлефонных нумароў не будзе. Перавагай новага стандарту з'яўляецца таксама тая акалічнасць, што абаненты мабільных апаратараў змогуць тэлефанаваць ва ўсе экстранныя службы без набору дадатковых лічбаў.

Усе гэтыя перамены — толькі першы крок на шляху прывядзення тэлефоннай нумарацыі Беларусі ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі. Другім этапам стане адмова ад традыцыйнай «васьмёркі» пры выхадзе на міжгароднюю і міжнародную сеткі: пры ажыццяўленні міжгародніх званкоў мы будзем набіраць для выхаду на міжгорад «0», а для міжнародных званоў — «00». Поўнае прывядзенне беларускай нумарацыі да міжнародных стандартаў планууецца завяршыць не пазней, чым у 2008 годзе.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**НОВАЯ НУМАРАЦЫЯ ДАВЕДАЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫХ СЛУЖБАЎ «БЕЛТЭЛЕКАМ» З 31 САКАВІКА 2007 ГОДА**

**«109»** — даведачная служба аб нумарах тэлефонаў кватэр і арганізацый
**«153»** — міжгародняя даведачная служба
**«166»** — прыём па тэлефоне тэлеграм, тэкставых і рэкламных аб'яў, будзільнік
**«171»** — заказ міжгародніх і міжнародных тэлефонных размоў
**«175»** — тарыфы на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі
**«188»** — служба дакладнага часу
**«190»** — «МінскГарІнфасэрвіс»
**«191»** — «Кінаафіша»
**«192»** — «Пасмяёмся!»
**«193»** — «Адпачынак і забавы»
**«194»** — «Гараскоп»
**«195»** — «Прагноз надвор'я»
**«196»** — «Казкі»
**«197»** — «Імяніны»
**«199»** — даведачная служба аб нумарах медыцынскіх устаноў, экстранных і аварыйных службаў.

## Сёння

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.07 | 16.38 | 8.31 |
| Віцебск — | 8.02 | 16.22 | 8.20 |
| Магілёў — | 7.57 | 16.28 | 8.31 |
| Гомель — | 7.47 | 16.31 | 8.44 |
| Гродна — | 8.21 | 16.54 | 8.33 |
| Брэст — | 8.15 | 17.01 | 8.46 |

**Месяц**

***Першая квадра ў 1.03***
***Месяц у сузор'і Цяльца***

**Імяніны**

***Пр.*** *Елізара, Пятра, Якава*
***К.*** *Ванды, Паўліны, Палікарпа, Ціта*

## Надвор'е на заўтра




**Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў**

## ...у суседзяў

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | -3 — -1 °С | | МАСКВА | -10 — -8 °С | Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | -4 — -2 °С | | РЫГА | -7 — -5 °С | |
| КІЕЎ | -5 — -3 °С | Без ападкаў | С-ПЕЦЯРБУРГ | -8 — -6 °С | |

## Дзве даты

## 26 студзеня

**1972 год** — Мінск стаў адзінаццатым горадам у Савецкім Саюзе, колькасць насельніцтва якога перавысіла 1 млн чалавек.

**1972 год** — пасажырка Весна Вулавіч (Югаславія) засталася жывой пасля падзення самалёта з вышыні больш як 10 тысяч метраў.

## Цытата дня

***«Не страшна адступаць — страшна не працягваць барацьбу. Няма сэнсу паміраць неразумна, калі можна адступіць, сабрацца з сіламі і перамагчы».***

**Японская прымаўка.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс: 292-04-52.
html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 499. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# ААТ «Слуцкі цукровафінадны камбінат»: ЕЎРАПЕЙСКІЯ ТЭХНАЛОГІІ І ЯКАСЦЬ



Цэнтрыфугоўшчык другога прадукту Тамара КОЗЕЛ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тым не менш добрыя прыклады гаспадарання дэманструюць і многія нашы землякі. Скажам, СВК «Агракамбінат «Сноў» Нясвіжскага раёна хоць і не ўваходзіць у слуцкую сыравінную зону, але там вучацца майстэрству высокіх ураджаяў прадстаўнікі гаспадарак з ўсёй Беларусі. Выдатных паказчыкаў дабіваюцца ў сельгаскааператывах «Кухчыцы» Клецкага, «Семежава» Капыльскага, «Аграфірма «Лучнікі» Слуцкага раёнаў. Словам, у кожным рэгіёне ёсць свае лідары.

У арбіце дзейнасці слуцкіх цукравытворцаў і чатыры раёны Магілёўскай вобласці — Бабруйскі, Кіраўскі, Асіповіцкі і Глускі, дзе нарыхтоўваецца прыкладна 150 тысяч тон цукровых буракоў.

Аб'ём сыравіны, які рэзка ўзрос, запатрабаваў ад кіраўніцтва камбіната дадатковых захадаў па яе размяшчэнню. Тэхналагічныя магчымасці летась не дазволілі прыняць увесь ураджай на свае пляцоўкі. Таму былі заключаны дагаворы на захоўванне прадукцыі непасрэдна ў гаспадарках з адпаведнай даплатай. Такім парадкам змаглі часова затрымаць на месцах каля 130 тысяч тон буракоў. Гэтая колькасць сыравіны пасля дастаўлялася на камбінат паступова аж да 20 студзеня 2007 года.

Зрэшты, як падкрэсліў Мікалай Паўлавіч, такая практыка шырока распаўсюджана ў заходнееўрапейскіх краінах. Там вырашчаны ўраджай захоўваюць самі вытворцы і пастаўляюць яго перапрацоўшчыкам па графіку. Гэта пазбаўляе цукровыя камбінаты ад неабходнасці займаць значныя зямельныя плошчы пад бурты ці кагаты, як іх тут называюць. У выніку з гарадской мяжы выдаляецца, скажам так, не самы прывабны «пейзаж», вытворчая тэрыторыя змяншаецца, што выгадна і камбінату і гораду. Прычым якасць буракоў, што захоўваюцца на месцах, значна лепшая, паколькі там аб'ёмы намнога меншыя і з імі лягчэй упраўляцца.



Галоўны шчыт кіравання завода — інжынер АСКТП Алена ГЕРАСІМОВІЧ.

Пытанне гэта надзвычай актуальнае і вартае разгляду на рэспубліканскім узроўні. Бо ўтрыманне перавалачных пунктаў — гэта дадатковыя затраты, якія кладуцца на сабекошт цукру, уплываюць на рэнтабельнасць, а ў рэшце рэшт на цэнавую канкурэнтаздольнасць прадукцыі.

Камбінат плаціць у год каля паўмільярда рублёў падаткаў за карыстанне зямлёй, утрымлівае штаты, вялікі парк тэхнікі для забеспячэння выгрузкі і буртавання буракоў. Якаснае захоўванне, да таго ж, — гэта і значнае павышэнне цукраўтрымання, выхаду цукру.

Заслугоўвае ўвагі і такі аспект, як больш рацыянальнае выкарыстанне аўтатранспарту на перавозках ураджаю. Наладзіўшы планамерную пастаўку буракоў на прадпрыемства, можна было б абысціся, скажам, тэхнікай аўтапаркаў Мінскай вобласці, а не «склікаць» яе ў аўральным парадку падчас уборкі з усіх абласцей рэспублікі. І тады сродкі, якія аддае акцыянернае таварыства на разлікі з транспартнікамі, не распыляліся б, а заставаліся ў сваім, сталічным, рэгіёне.



Дырэктар ААТ «Слуцкі цукровафінадны камбінат» Мікалай ПРУДНІК.

Сёлетняя анамальная зіма ўвогуле дадала клопату завадчанам. Пры павышанай атмасфернай тэмпературы буракі ў кагатах праграваліся, захоўваліся горш, трацілі цукрыстасць. Сітуацыя ўскладнілася яшчэ і тым, што 30 кастрычніка, а затым 6—8 лістапада «выскачылі» небывалыя для гэтай пары маразы і «прыхапілі» верхні пласт буртоў. Якой мабілізацыі сіл і сродкаў запатрабавала становішча, каб не дапусціць звышнарматыўных страт, каб адстаяць сыравінныя запасы! І калектыў на чале з кіраўніцтвам перамог.

Камбінат ужо завяршае перапрацоўку буракоў сваёй нарыхтоўкі і цяпер прымае частку ўраджаю з сыравіннай зоны Скідальскага камбіната, дзе магутнасці некалькі меншыя, і адчуваецца няўпраўка. Адтуль, у прыватнасці з Бераставіцкага раёна, павінна паступіць у Слуцк 35 тысяч тон буракоў.

## З БРЭНДАМ «ПРАДУКТ ГОДА»

Што запас бяды не чыніць, нашы продкі ведалі здавён. І дбайны беларус заўсёды трымаў сёетое ў засеках. Але калі такое магутнае прадпрыемства, як Слуцкі цукровафінадны, якое ў разгар сезона ў суткі выдае «на-гара» звыш 1000 тон бялюткай, быццам горны снег, салодкасці, арыентаванае на экспарт прадукцыі, вымушана прыпыніць пастаўкі, працаваць на склады, гэта, вядома ж, абставіна не з прыемных. Толькі ад завадчан тут мала што залежыць. Яны ведаюць адно: прадукт іх выдатны, прайшоў «выпрабаванне» на збыт па ўсёй паўночна-заходняй частцы Расіі — ад Пскова да Архангельска. І таму вераць, што «цукровы перадзел» — з'ява часовая. За праблему ўзяўся ўрад краіны, і яна, трэба спадзявацца, будзе вырашана.

Таму акрэсленую тэму кіраўніцтва камбіната імкнецца тактоўна і далікатна абмінаць, разумеючы, што лішнія размовы толькі падліваюць масла ў агонь.

Пра рэалізацыю тут больш клапоцяцца з пункту гледжання рэкламы сваёй прадукцыі, яе зручнай фасоўкі. У кабінеце Восіпа Дапіры мы ўбачылі, можа, з дзесятак розных пакецікаў і кардонных скрыначак, у якіх цукар трапляе ў рознічны гандаль. Слуцкі камбінат, у адрозненне ад іншых, фасуе прадукт у празрыстыя аднакілаграмовыя поліэтыленавыя пакеты, каб пакупнік бачыў, які тавар яму прапануецца. Працуе таксама лінія па расфасоўцы ў маленькія 10-грамовыя пакецікі, на аднаразовую порцыю, з нанясеннем на ўпакоўцы лагатыпаў заказчыкаў. І хоць у агульным продажы аб'ём такога кшталту паставак не надта вялікі, каля 125 тон, але яны робяць яшчэ адну важную справу — рэкламную. Беларуская чыгунка, многія рэстараны, кафэ жадаюць мець тавар менавіта ў такім выглядзе.

Высокая ж ступень ачысткі цукру, у тым ліку мікрабіялагічнай, з выкарыстаннем самага сучаснага еўрапейскага абсталявання, прыцягвае да Слуцка шырокае кола беларускіх спажыўцоў, у тым ліку тых, дзе да чысціні цукру асобныя патрабаванні. Сярод іх Мінскі завод медпрэпаратаў, фірма «Кока-кола», завод ігрыстых вінаў, лікёра-гарэлачныя прадпрыемствы і г.д.



Галоўны бухгалтар Соф'я МІХАЙЛАВА.

За плённае супрацоўніцтва, паспяховае ажыццяўленне сумесных праектаў камбінат мае шэраг узнагарод і падзяк ад прызнаных у цукраварнай справе еўрапейскіх фірмаў «Басф», «Баер», «Аграматко».

А летась слуцкі цукар быў удастоены дыплома першай ступені ў сваёй намінацыі на IX Рэспубліканскім конкурсе прадуктаў харчавання, атрымаў брэнд «Прадукт года-2006» і права выкарыстання яго на працягу года на сваёй упакоўцы.

Гэтаму поспеху паспрыяла мнагапланавая работа, а таксама ўкараненне аўтаматычнай сістэмы кіравання тэхналагічным працэсам. З галоўнага шчыта кіравання па камп'ютарах можна сачыць за параметрамі на кожным звяне тэхналагічнага ланцуга і пры неабходнасці карэктаваць іх. Дарэчы, усе праграмы для гэтай сістэмы напісала заводскі праграміст Таццяна Зайкевіч, якая прайшла адпаведную падрыхтоўку ў Маскве.

## СТАЯЦЬ У БАКУ ТУТ НЕЛЬГА

Такіх адданых сваёй справе спецыялістаў, рабочых у калектыве шмат. Тут кожны даражыць сваім месцам, ганарыцца тым, што працуе на вядучым прадпрыемстве горада.

— Тэхнічнае ж развіццё вытворчасці «стартуе» ад службы галоўнага інжынера. І яна, на мой погляд, у нас даволі моцная, — дапаўняе ўражанні ад нашага «падарожжа» па заводскіх участках Восіп Дапіра. — Галоўны інжынер Юрый Гарбатко і яго памочнікі выдатна ведаюць сваю справу. Тое ж можна сказаць пра галоўнага спецыяліста КВП і аўтаматыкі Уладзіміра Якімовіча. З усіх чатырох цукровых заводаў Беларусі ў нас самы высокі ўзровень аўтаматыкі і да таго ж самы якасны.

У службе галоўнага механіка самыя цёплыя водгукі можна пачуць пра старшага майстра прадуктовага аддзялення Мікалая Каралькова. Там, дзе гатовая прадукцыя, усё павінна быць на сваім месцы, працаваць бездакорна. І ён такі парадак забяспечвае.



Старшы электраманцёр Анатоль ЛАБКОЎСКІ.

Увогуле ўсе галоўныя спецыялісты вартыя пахвалы. Сёлета, калі як ніколі вялікім быў аб'ём нарыхтовак сыравіны, яна прымалася без асаблівых затрымак, без вялікіх чэргаў. Найперш таму, што буртаўкладачная тэхніка працавала без паломак. А паклапаціліся аб гэтым начальнік аддзела вонкавай механізацыі Аляксандр Таранін, галоўны энергетык Серафім Маркавец.



Старшыня назіральнага савета ААТ, галоўны спецыяліст па гатовай прадукцыі Восіп ДАПІРА.



Начальнік змены Валянціна НАРОНСКАЯ.

Вялікай увагі патрабуе бястарнае захоўванне цукру, яго фасоўка ў розныя віды тары. Аднак тут на сваім месцы начальнік цэха гатовай прадукцыі Аляксандр Разуеў, наладчыкі абсталявання Уладзімір Статкевіч і Аляксандр Курыльчык.

Штогод на прадпрыемстве пераможцамі спаборніцтва за званне «Лепшы рабочы па прафесіі» прызнаецца група найбольш дастойных працаўнікоў з усіх участкаў вытворчасці. Цяпер у гэтым спісе 37 чалавек, усе яны ўзнагароджаны граматамі і грашовымі прэміямі. У іх ліку апаратчыкі Таццяна Хартановіч і Таццяна Мароцкая, абпальшчык вапняку Пётр Клімянкоў, аператар пульта кіравання Генадзь Шуба, слесар-рамонтнік Леанід Ганчар, электраманцёр Віктар Вітко і іншыя.

— Калектыў у нас надзвычай стабільны, цякучасць кадраў практычна адсутнічае, — не без гонару прызнаваўся дырэктар Мікалай Прўднік. — Большасць пакідае прадпрыемства толькі тады, калі надыходзіць пара ісці на пенсію.

Заўважым, што з пенсіянерамі тут развітваюцца не раптоўна. Як правіла, з той даты, калі чалавек набывае новы статус, з ім заключаецца кантракт яшчэ на адзін год, каб ён паступова прывыкаў да непазбежнасці звальнення, псіхалагічна рыхтаваўся пакінуць калектыў.



Новапабудаваны склад безтарнага захоўвання цукру.

Заработная плата ў цукраваў даволі прыстойная, выплачваецца своечасова. Яе ўзровень, бадай, самы высокі ў Слуцкім раёне і ва ўсёй галіне, дасягнуў у сярэднім 900 тысяч рублёў.

Сацыяльна-бытавую падтрымку некаторыя з працуючых атрымліваюць у выглядзе месцаў ці пакояў у інтэрнаце сямейнага тыпу і агульным, дзе звычайна рассяляецца моладзь. А сюды яна ідзе з задавальненнем. І ў бліжэйшай перспектыве камбінат будзе прымаць на працу прыкладна па 20 чалавек у год замест ветэранаў, якія пойдуць на заслужаны адпачынак.



У лабараторыі хімічнага аналізу: Ала НАВУМОВІЧ і Надзея ЗАХАРАВА.

Як правіла, прадпрыемства ўладкоўвае выпускнікоў профільнага Слуцкага каледжа харчавікоў. Яны праходзяць тут вытворчую практыку, і тыя, хто праяўляе сябе добрымі ведамі, адказным стаўленнем да абавязкаў, павагай да традыцый прадпрыемства, трапляюць у поле зроку кіраўніцтва.

— З іншага боку, калі маладому чалавеку не вызначаны канкрэтны ўчастак работы і ён бачыць, як нехта робіць справу, а яму прапанавана быць у баку ад яе ці на правах «прымі-падай», то гэты работнік можа быць сапсаваны, — па-бацькоўску разважае Мікалай Паўлавіч. — З яго не атрымаецца ні нармальнага рабочага, ні спецыяліста. Яго прывучаць быць за чужой спінай.

Таму на камбінаце ўзята за правіла: кожны з першых дзён павінен атрымаць сваё кола абавязкаў і несці персанальную адказнасць за даручаны ўчастак, незалежна ад пасады. Спраўляецца чалавек — выдатна! Не атрымліваецца штосьці — дапамогуць. Ну, а калі захаплення работай няма, калі справы прадпрыемства яму не цікавыя — даводзіцца развітвацца. Такія выпадкі не частыя, а ўсё ж здараюцца.

На камбінаце каля 40 чалавек з вышэйшай адукацыяй працуюць на рабочых пасадах. І для прафесійнага росту тут створаны ўсе ўмовы. Многія былыя выпускнікі каледжа вучацца ў ВНУ завочна.

Моцнай падтрымкай працаўнікоў, якія маюць патрэбу ў жыллі, стане будаўніцтва 100-кватэрнага жылога дома. Праўда, пры ўмове, што ўдасца вырашыць пытанне з выдзяленнем зямельнага ўчастка недалёка ад прадпрыемства, каб яго жыхарам было зручней дабірацца на работу. Акцыянернае таварыства мае магчымасць выдзеліць жадаючым крэдыт у памеры каля 25 працэнтаў кошту кватэры з наступным пагашэннем яго праз утрыманні з заработнай платы, дапамагчы падрадчыку пад'ёмнымі кранамі, транспартам, іншай тэхнікай. І галоўнае, праз прафсаюзны камітэт таварыства зможа кантраляваць будоўлю, каб ніхто не ўздумаў падмануць забудоўшчыкаў.

Свой вольны час многія работнікі камбіната прысвячаюць развіццю сваіх захапленняў і талентаў. Умовы і магчымасці для гэтага дастатковыя. Праз вуліцу, у адным будынку з заводаўпраўленнем знаходзіцца Дом культуры, дзе сабрана выдатная бібліятэка, ёсць глядзельная, танцавальная, спартыўная залы. Секцыі і гурткі пры ДК наведваюць многія жыхары бліжэйшага мікрараёна, дзе пражываюць у асноўным працаўнікі свайго прадпрыемства, а таксама мясакамбіната, сыраробнага камбіната.

Раней выдатны клас гульні дэманстравала футбольная каманда цукравараў, якая апошнія два гады выходзіла на другое месца ў абласным першынстве. Сёлета ж аказалася першай, але ўжо ў другой падгрупе, а гэта фактычна толькі сёмы радок у турнірнай табліцы. Негатыўна адбіўся на выніковасці працэс амаладжэння складу каманды футбалістаў. І ўсё ж заўзятыя балельшчыкі, шчырыя прыхільнікі каманды вераць, што яна зноў выйдзе на сваю лепшую гульню.

Бо менавіта такі высокі тэмп і высокую выніковасць, прадукцыйнасць працы паказвае цяпер асноўная вытворчасць, усе падраздзяленні камбіната. На відным месцы ля цэнтральнага ўваходу ў галоўны корпус пастаянна вывешаны шчыт, на якім фіксуюцца паказчыкі работы ўсіх чатырох цукровых прадпрыемстваў. І да гонару случчан, апошнія дзве дэкады яны лідзіруюць па аб'ёму выпрацоўкі салодкага прадукту.

Як бачна, пры ўсіх складанасцях, з якімі давялося сутыкнуцца гэтай восенню і зімой, ААТ «Слуцкі цукровафінадны камбінат» паспяхова завяршае сезон перапрацоўкі. Завяршае, але не збіраецца пачываць на лаўрах ранейшых дасягненняў. Бо наперадзе яшчэ не да канца вырашаныя задачы па далейшаму абнаўленню вытворчых магутнасцяў, удасканаленню тэхналагічнага працэсу. І верыцца, што яны будуць выкананы гэтак жа бездакорна, як і ўсё, што зроблена раней.

**Мікалай КАЧАТКОЎ,**
**Віктар ПАЗНЯКОЎ.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**



Слесар-наладчык Мікалай ЯНОВІЧ каля апарата дробнай фасоўкі.



Аператар кіравання цукровай вытворчасцю Віталь ТАРАН.



Наладчык Ігар ПАЎЛЕЙЧЫК.



У заводскай сталовай. Касір Ала ПОНТУС.



Бібліятэку Дома культуры прадпрыемства наведваюць дарослыя і дзеці. Бібліятэкар Алена ОСІПАВА з юнымі чытачамі Насцяй ТУМІЛОВІЧ і Насцяй БАКАНАВАЙ.

**ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА!**

**НАШ АДРАС:**
223610,
МІНСКАЯ ВОБЛ.,
Г. СЛУЦК,
ВУЛ. ГАЛАВАШЧАНКІ, 6

ТЭЛ/ФАКС (01795)
4-66-75, 5-55-89,
5-55-90,

ТЭЛЕТАЙП
301523 SAHAR BY,

E-MAIL: SUGAR@MAIL.BELPAK.BY